

# ПРЭЗІДЭНТ ПАДПІСАЎ ДЫРЭКТЫВУ № 11

**Яна датычыцца выканальніцкай дысцыпліны і функцыянавання органаў улады**

(Працяг на стар. 2–3)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

3 КРАСАВІКА 2025 г. ЧАЦВЕР № 65 (30453)

АДУКАЦЫЯ

## ДЗЯЎЧАТЫ, ПОЙДЗЕМ У КАЛЕДЖ!

**Сярэднія спецыяльныя і прафесійна-тэхнічныя навучальныя ўстановы ўсё яшчэ лічацца «не жаночым» месцам, хоць у іх дастаткова прафесій, якія зацікавяць дзяўчат**



Сёння мы закранулі тэму сярэдняй спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыі і пошуку месца ў гэтай сферы для дзяўчат. Так ужо павялося, што сённяшнія каледжы, а раней — вучылішчы і тэхнікумы, не лічацца тым самым лепшым месцам, дзе прадстаўніцы прыгожага полу могуць паспяхова працягваць сваю адукацыю. Гэты стэрэатып прыводзіць да таго, што многія дзевяцікласніцы як учора, так і сёння аўтаматычна паступаюць у старшую школу і нават не разглядаюць іншыя варыянты. Але на сучасныя каледжы і тэхнікумы ім варта звярнуць увагу. Дэталёва ў гэтых і іншых пытаннях мы разбіраемся разам з начальнікам упраўлення прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі Беларусі Аляксандрай ПЯТРОВАЙ.





СТАР. 12

ЧЫМ БУДЗЕ ЗДЗІЎЛЯЦЬ СВЯТОЧНЫ ПАРАД

8–9



Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

СКАЖЫЦЕ, ДОКТАР...

## ТАЙНЫ ІМУНІТЭТУ

**Ці можна яго перагрузіць прышчэпкай і як умацаваць?**

Наша імунная сістэма многімі ўспрымаецца як terra incognita, нейкае эфемернае ўтварэнне: яго нельга разгледзець ні на УГД, ні на рэнтгене, ды і адным аналізам яго дзейнасць не вымераць. Але пры гэтым практычна кожны другі лічыць, што імунітэт трэба абавязкова ўмацоўваць восенню, а вясной дык і пагатоў. Інакш чым можна растлумачыць павальнае захапленне ці то імунамадулятарамі, ці то вітамінамі, ці то біялагічна актыўнымі дабаўкамі. Пра прыкметы, якія насамрэч сведчаць аб зніжэнні імунітэту, міфы аб яго перагрузцы і дзейсныя метады ўмацавання, расказала **урач-гігіеніст аддзела грамадскага здароўя Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Алена ЛОЙКА.**



СТАР. 15

ISSN 1990 — 763X

25065>

# «ВЕЛЬМІ ПАТРЭБНАЯ І СВОЕЧАСОВАЯ

## Падпісаны Прэзідэнтам дакумент важны для ўсіх

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 2 красавіка падпісаў Дырэктыву нумар 11 «Аб удасканаленні функцыянавання сістэмы органаў улады і кіравання, узмацненні выканальніцкай дысцыпліны», паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Дакумент прыняты ў развіццё ўказаў «Аб пяцігоддзі якасці», «Аб узмацненні ролі старшынь выканаўчых камітэтаў базавага ўзроўню ў развіцці рэгіёнаў» і накіраваны на кардынальнае павышэнне эфектыўнасці функцыянавання сістэмы органаў дзяржаўнай улады, кіраўніцкай дзейнасці, узмацненне выканальніцкай дысцыпліны, сацыяльна адказнага стаўлення кожнага да працы.

У адпаведнасці з дырэктывай недапушчальна ўмяшанне дзяржаўных органаў, службовых асоб у кампетэнцыю адзін аднаго. Выключаецца фарміраванне і функцыянаванне саветаў, камісій, груп, іншых экспертных і кансультацыйна-дарадчых структур, якія падмяняюць дзяржаўныя органы, акрамя непасрэдна прадугледжаных заканадаўчымі актамі. Забараняецца неабгрунтаванае правядзенне нарад, у тым ліку ў дыстанцыйным фармаце.

Дакументам прадугледжваецца ўкараненне ў практычную дзейнасць сучасных лічбавых тэхналогій у дзяржаўным кіраванні, павышэнне эфектыўнасці службовых камандзіровак, правядзенне абавязковай ацэнкі стану выканальніцкай дысцыпліны ў дзяржаўным органе, улік яе пры прадаўжэнні або заключэнні з кіраўніком гэтага органа кантракта на новы тэрмін, рыняцці рашэнняў па выніках атэстацыі гэтага кіраўніка, павышэнні яго на пасадзе, прадстаўленні да дзяржаўных узнагарод.

Дырэктыва змяшчае нормы аб неабходнасці ўпарадкаваць працэс збору інфармацыі і скараціць залішнія запыты ў адрас юрыдычных асоб, а таксама забяспечыць інфармацыйную бяспеку.

Карэспандэнты «Звязды» з гэтай нагоды звярнуліся па каментарыі да прадстаўнікоў розных галін і ўзроўняў улады і кіравання.



**Ігар СЯРГЕЕЎ, генеральны дырэктар ААТ «Беларускі цэментны завод», член Савета Рэспублікі,** адзначае: «Дырэктыва прадугледжвае дасягненне нулявой бюракратыі. У прыватнасці, прадугледжана мінімізацыя выканання дакументаў на папяровых носьбітах, тым самым аддаючы перавагу ўкараненню ў практычную дзейнасць сучасных лічбавых тэхналогій. Таксама аптымізавана прыняцце прававых актаў: зніжана колькасць узгадненняў для зацвярджэння, прадугледжаны тэрміны іх разгляду. Прынятыя акты павінны быць прапрацаваны такім чынам, каб у далейшым не патрабавалі тлумачэнняў і не ўтрымлівалі спасылкі на іншыя адсылачныя нормы, што значна спрашчае працу з дакументам».

Кадры вырашаюць усё, падкрэслівае кіраўнік буйнога прадпрыемства. «Таму дзяржаўным органам усіх узроўняў пры фарміраванні кадравага складу неабходна звяртаць увагу на наяўнасць кампетэнцый у кандыдата, неабходных для выканання службовых абавязкаў ва ўмовах сучасных патрабаванняў. Таксама заключэнню або прадаўжэнню кантракта з кіраўніком дзяржаўнага органа або арганізацыі будзе папярэднічаць аналіз і ацэнка выканальніцкай дысцыпліны па пэўных крытэрыях», — абазначае важныя навацыі Ігар Сяргееў і дадае, што яны і іншыя палажэнні дырэктывы павысяць узровень адказнасці на працоўных месцах.



**Ірына ДАЎГАЛА, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Палаты прадстаўнікоў,** звярнула ўвагу на шматграннасць дакумента, падпісанага кіраўніком дзяржавы. «Вялікі мой вопыт работы ў органах дзяржаўнай улады даваляе абсалютна ўпэўнена казаць аб тым, што такія дакументы не нараджаюцца за адзін дзень, — адзначыла дэпутат. — Гэты дакумент дакладна, сістэмна і вельмі канкрэтна расстаўляе ўсе кропкі над «і» па тых акцэнтах выканальніцкай дысцыпліны, якія неабходна ўзмацніць. У першую чаргу размова ідзе практычна аб усіх галінах дзяржаўнай улады».

Парламентарый нагадала, што не так даўно адпаведным указам Прэзідэнт даў шырокія паўнамоцтвы кіраўнікам мясцовых органаў улады. «Калі паўнамоцтвы дадзены, за іх трэба несці адказнасць», — акцэнтавала ўвагу Ірына Даўгала.

> **— У дырэктыве вельмі дакладна расстаўлены прыярытэты па ўзмацненні дысцыпліны ў першую чаргу па эканамічных кірунках. Размова ідзе не толькі і не столькі аб выкананні прагнозных паказчыкаў, што сапраўды з'яўляецца больш чым важным і неабходным. Не менш важны момант — працоўныя рэсурсы. Кіраўнік дзяржавы ўказвае на неабходнасць удзелу працаздольных людзей у эканамічнай сістэме краіны. Гэта значыць: калі вы карыстаецеся выгодамі, дадзенымі дзяржавай, то вы і працаваць павінны адпаведна.**

Асаблівую ўвагу парламентарый звярнула на пытанні інфармацыйнай дысцыпліны. Гэта, па яе словах, датычыцца не толькі органаў улады ўсіх галін, але і саміх грамадзян. Дэпутат выказала спадзяванне, што ўсе органы ўлады сістэматызуюць і зменшаць колькасць правядзення нарад, у тым ліку ў відэафармаце. «Гэта дастаткова сур'ёзная праблема, бо займае вялікі дыяпазон часу шараговых дзяржаўных служачых або кіраўнікоў структурных падраздзяленняў, — канкрэтызавала Ірына Даўгала. — Яшчэ кіраўнік такога рангу, як Сувораў, казаў, што дзе дысцыпліна — там і перамога. Так што дысцыпліна — і ў нас перамога будзе ва ўсім».



Дзякуючы Дырэктыве № 11 у рабоце Мінскага гарвыканкама стане менш нарад і больш увагі будзе аддадзена службовым камандзіроўкам — **Надзея ЛАЗАРЭВІЧ, першы намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама, каментуючы дакумент,** звяртае ўвагу на яго практыкапрымяняльныя аспекты.

«Будзем больш уважліва глядзець на план мерапрыемстваў і камандзіровак, больш адказна будзем кантраляваць справаздачы па выніках камандзіровак і пытацца аб іх выніковасці не толькі ў мясцовых органаў улады, але і ў суб'ектаў гаспадарання», — адзначае яна.

«Вельмі выразна будзем адпрацоўваць уваходныя дакументы, якія прыходзяць да нас, — дадае Надзея Лазарэвіч. — Але з нас не толькі патрабуюць больш, нам дадзены дадатковыя магчымасці і функцыянал для мясцовых органаў улады. Дзяржава заўсёды кажа, што з пытаннямі на месцах трэба разбірацца максімальна хутка, прымаць аператыўныя і прадуманыя рашэнні. Іх мы і будзем выконваць».



**Тамара КРАСОЎСКАЯ, старшыня Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага аблвыканкама, член Савета Рэспублікі**, пераканана, што ад выканальніцкай дысцыпліны ў органах улады напрамую залежыць высокая эфектыўнасць кіравання, бо дакладнае выкананне рашэнняў і даручэнняў паскарае рэалізацыю дзяржаўных праграм. «Калі дзяржорганы працуюць зладжана і выконваюць абяцанае, людзі больш давяраюць уладзе, што ўмацоўвае сацыяльную стабільнасць», — адзначае яна.

На думку Тамары Красоўскай, высокі ўзровень дысцыпліны нязменна прыводзіць і да эканамічнай выгады, бо ў такіх сферах, як будаўніцтва, ЖКГ і іншых, невыканальнасць нярэдка прыводзіць да зацягвання тэрмінаў рэалізацыі праектаў, што прыводзіць да іх падаражання, нямэтавага выкарыстання сродкаў, у тым ліку бюджэтных.

> **«Нам трэба разумець: сёння для рэалізацыі стратэгічных дзяржаўных мэт, нацыянальных праектаў і праграм патрэбна зладжаная, скаардынаваная работа ўсіх узроўняў улады, установ, ведамстваў, — гаворыць сенатар. — А без дакладнага парадку, высокай дысцыпліны нават найлепшыя ініцыятывы «гінуць» у невыкананні. І ў сувязі з гэтым дысцыпліна важная не толькі як мэта, але і як інструмент для дасягнення рэальных вынікаў».**

«Падпісанне Прэзідэнтам Дырэктывы № 11 — гэта лагічны і важны крок у мадэрнізацыі і павышэнні дысцыпліны органаў дзяржаўнага кіравання, — гаворыць **Дзмітрый ДЗЯМІДАЎ, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў.** — Менавіта з улікам таго, што асноўным кірункам дзейнасці дэпутацкага корпуса з'яўляецца цесная работа з людзьмі, прыняты дакумент будзе дадаткова кантраляваць дадзеныя абяцанні, узровень выканаўчай дысцыпліны. Гэта значыць, што ў перспектыве мы павінны дайсці да мінімальнага ўзроўню праблемных зваротаў падчас прыёмаў грамадзян праз удасканаленне работы мясцовай улады і адказных арганізацый».



На думку кіраўніка дэпутацкага корпуса Віцебшчыны, прыняцце дырэктывы — гэта вялікі ўклад у павышэнне якасці жыцця беларусаў праз прафесіяналізм і зладжанасць работы ўлады, а ўзаемадзеянне паміж галінамі ўлады і грамадскасцю стане асновай для дасягнення пастаўленых краінай мэт.



Пры правільным прачытанні дырэктыва стане надзейным фундаментам для павышэння эфектыўнасці функцыянавання ўсіх органаў дзяржаўнай улады на месцах, адзначае **Людміла САПЕГА, генеральны дырэктар Гомельскага гандлёва-вытворчага РУП «Фармацыя», член Савета Рэспублікі.** «А без гэтага немагчыма вырашыць амбіцыйныя задачы па карэнным павышэнні ўзроўню дабрабыту жыхароў усіх рэгіёнаў краіны, пастаўленыя Аляксандрам Лукашэнкам на найбліжэйшыя пяць гадоў. Невыпадкова асаблівая роля ў гэтым адводзіцца ўзмацненню выканальніцкай дысцыпліны, — працягвае сенатар. — Прычым у самым шырокім яе разуменні: ад працоўнай і вытворчай да асабістай адказнасці кожнага за даручаны ўчастак работы і рацыянальнага выкарыстання працоўнага часу. Іншымі словамі, падпісаная кіраўніком дзяржавы Дырэктыва № 11 павінна паставіць надзейную заслону найменшым праявам бюракратызму і заарганізаванасці ў дзейнасці дзяржаўных органаў і нацэліць іх на эфектыўнае вырашэнне праблем, звязаных з пытаннямі паляпшэння якасці жыцця нашых грамадзян».

# ДЫРЭКТЫВА»



Па словах **Кацярыны СЕРАФІНОВІЧ, члена Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў,** гэта своечасовы дакумент. «Ёсць у ім сказ, які мне вельмі падабаецца і які лічу важным на ўсіх адрэзках часу: «Добрасумленным, адказным, творчым стаўленнем да службовых абавязкаў, высокапрадукцыйным выкарыстаннем рабочага часу кожны з нас уносіць свой уклад у агульны дабрабыт і стабільнасць краіны», — прывяла прыклад дэпутат. — Мы ўжо звыкліся з тым, што ўзровень жыцця ў Беларусі высокі і як данасць успрымаем камфорт, добраўпарадкаванне, сацыяльныя выгоды. Часам і не ўспамінаем, што такая якасць жыцця не матэрыялізуецца з паветра, а з'яўляецца вынікам працы, працы кожнага з нас».

Кажучы аб тым, што зменіцца згодна з прынятай дырэктывай, Кацярына Серафіновіч заўважыла, што тыя кіраўнікі, спецыялісты, якія ў сваёй прафесійнай дзейнасці кіраваліся выключна інтарэсамі сваёй справы, вырашалі пытанні ў рамках уласнай кампетэнцыі, укаранялі лічбавыя тэхналогіі і не дапускалі парушэнняў працоўнай дысцыпліны ў калектыве і асабіста, працягнуць працаваць у звыклым для сябе тэмпе. «А вось тым, хто не столькі працаваў, колькі імітаваў працоўную дзейнасць, варта перагледзець сваё стаўленне да службовых абавязкаў», — дапоўніла дэпутат.

Парламентарыю імпануе, што новым заканадаўчым актам прадугледжваецца і забарона правядзення неабгрунтаваных нарад, у тым ліку ў дыстанцыйным фармаце.

**«Час — самы каштоўны рэсурс, які ў нас ёсць, і траціць яго патрэбна рацыянальна, па-гаспадарску, — перакананa яна. — Не будзем скідваць з рахунку і настрой людзей, якіх збіраюць чарговы раз пагутарыць, а ім трэба вырашаць ужо пастаўленыя задачы, кантраляваць працэс работы».**



Строгая выканальніцкая і службовая дысцыпліна неабходна для паспяховага развіцця не толькі канкрэтна ўзятага рэгіёна, але і ўсёй нашай краіны ў цэлым, а таксама для павышэння патэнцыялу ўсіх галін эканомікі і не толькі, адзначае **Людміла МУРАВІЦКАЯ, старшыня Лагойскага раённага Савета дэпутатаў.**

Паводле яе слоў, дырэктыва надасць імпульс для больш выразнага ўзаемадзеяння мясцовых органаў улады і грамадзян Беларусі: «У дакуменце пазначаны пытанні, на якія трэба звярнуць увагу, — мінімізацыя непатрэбных сустрэч, нарад, узмацненне пазіцый у выглядзе якаснай адпрацоўкі дакумента пры ўзаемадзеянні з нашымі грамадзянамі і суб'ектамі гаспадарання».

Кіраўнік дэпутацкага корпуса Лагойшчыны падкрэсліла, што гэтым дакументам прадугледжваецца ўкараненне ў практычную дзейнасць сучасных лічбавых тэхналогій у дзяржаўным кіраванні і павышэнне эфектыўнасці службовых камандзіровак: «Дзякуючы камандзіроўкам у першую чаргу можна на свае вочы ўбачыць, чым жыве той ці іншы населены пункт або рэгіён, якія цікавыя пункты росту для супрацоўніцтва ён прапаноўвае. Наша задача ў камандзіроўках — дапамагчы прадпрыемствам, даведацца, якія праблемныя пытанні хвалююць людзей і, вядома ж, наладзіць добрыя ўзаемаадносіны».

Акрамя таго, Дырэктыва № 11 накіравана на дэбюракратызацыю, спрашчэнне ўсіх адміністрацыйных і кіраўніцкіх працэсаў. «Дысцыпліна важная не толькі як мэта, але і як інструмент для дасягнення рэальных вынікаў, — гаворыць Людміла Муравіцкая. — Перакананa, што рэалізацыя палажэнняў дакумента стане новым этапам у пабудове моцнай, сацыяльна арыентаванай дзяржавы, дзе інтарэсы чалавека застаюцца найвышэйшым прыярытэтам».



**Рыгор ПРАТАСАВІЦКІ, старшыня Столінскага райвыканкама,** прызнаецца, што з першага азнаямлення з дакументам яго асабліва зачапіла патрабаванне забароны неабгрунтаванага правядзення нарад, у тым ліку ў дыстанцыйным фармаце. «Вядома, цяперашні стан тэхнікі і тэхналогій дае магчымасць аператыўна правесці нараду без збору яе ўдзельнікаў у адным месцы. Можна далучыцца да абмеркавання той ці іншай тэмы не выходзячы з будынка свайго выканкама, — гаворыць кіраўнік раённай вертыкалі. — Але ж гэтым сталі надта часта калі не злоўжываць, то захапляцца. І вось ужо сядзяць тыя ж старшыні сельсаветаў на нарадзе паўдня ў райцэнтры. Дадаць сюды час на дарогу, а ў некаторых яна ў адзін канец складае паўсотні кіламетраў, і выходзіць, што траціцца цэлы рабочы дзень. А эфектыўнасць работы гэтых людзей найбольш праяўляецца на месцах, «на зямлі», як гаворыць наш Прэзідэнт. Інфармацыю ж па выніках нарады сёння магчыма давесці хутка і дакладна дзякуючы ўсё тым жа інфармацыйным тэхналогіям... Прыклады можна прыводзіць фактычна па ўсіх пунктах дырэктывы. Лічу яе патрэбнай і своечасовай. Думаю, што дакумент паспрыяе нашай рабоце ў рэгіёнах».

АКТУАЛЬНА

## ЗА СПРАВУ!

### Рэспубліканскі суботнік пройдзе ў Беларусі 12 красавіка

**Адпаведную пастанову падпісаў прэм'ер-міністр Аляксандр Турчын, паведамілі ў прэс-службе ўрада.**

**Тут дадалі, што грашовыя сродкі, заробленыя ў дзень правядзення суботніка, у тым ліку на працоўных месцах, пойдуць на будаўніцтва Нацыянальнага гістарычнага музея Беларусі.**

ПА СУТНАСЦІ

## КАДРЫ, ЯКІЯ ВЫРАШАЮЦЬ УСЁ



Птушыны гоман над жамчужынамі беларускага дойлідства і велічнымі зялёнымі пушчанскімі шатамі, дзіцячы гоман у гарадах і, што асабліва радуе, у вёсках — па ўсім відаць — вясна ідзе. Гэта сапраўдныя кадры нашага жыцця. Час надзей, час чакання новага, але разам з тым і час руплівых спраў. Каб захаваць і ўзбагаціць тое, што маем, варта не толькі не забывацца пра пратаптаны шлях, але і пракладваць новыя напрамкі. Мабыць, у гэтым карэнная сутнасць кадравай палітыкі кіраўніка дзяржавы, як і ў вірлівым прыродным кругавароце, — абнаўленне.

На завяршальным этапе фарміраванне новай каманды Першага і працяг напісання прэзідэнцкага нататніка для кіруючых асоб. А менавіта, «наша жыццё нішто ў параўнанні з тым, што мы павінны зрабіць для краіны». Гэты пасыл Першага акумулюе «залатое правіла» беларускай кіраўніцкай думкі.

Новы склад урада пасля выбараў Прэзідэнта — ужо данасць. Але персаналіі па многіх кірунках былі падабраны яшчэ да электаральнага цыкла. Шчыра і празрыста: вось, маўляў, каманда, з якой Аляксандр Лукашэнка ідзе на выбары. Пасля ўрадавы пул Першага дапоўнілі. Засталіся і прыйшлі прафесіяналы. Але кожнаму новаму складу аб'ектыўна цяжэй, чым папярэдняму. Не таму што параўноўваюць, а задачы больш сучасныя і складаныя.

З вайскоўцамі і сілавікамі ўсё зразумела. На гэтых пасадах прафесіяналы і патрыёты. Усе задачы выконваюць як мае быць. Прэзідэнт ведае шмат нюансаў, а для грамадства іх работа часам незаўважная, значыць выканана на «выдатна».

Наогул, інсінуацый было шмат. Так заўсёды. Замежныя «палітолагі» і «эксперты», якія маюць патрэбу ў праглядах, часта любяць «карміць» гледачоў і чытачоў «вострым прадуктам». Выдумкамі прыцягваць цікавасць да сябе. Змена ўрада і абмеркаванне пытанняў эканамічнага характару заўсёды падагравалі чуткі аб эмісіі грошай. На гэтых замшэлых, як беларуская апазіцыя, міфах часта будуюць свае прагляды заморскія «эканамісты» з прапіскай у беларускіх інтэрнатах. Спачатку прэм'ер-міністр Турчын расчараваў гэтых «аналітыкаў» — уключаць друкарскі станок у Беларусі не будуць. А Прэзідэнт «прызнаўся»: станок той стаіць у кабінеце Першага і даўно пакрыўся пылам.

Празрыстыя задачы: эканамічны рост, рост інвестыцый — за пяцігодку прыкладна на трэць, далейшае развіццё ініцыятывы «Адзін рэгіён — адзін праект». Складаная задача — спыніць адток людзей з рэгіёнаў.

Варта, каб да 2030 года сектар малога і сярэдняга прадпрымальніцтва фарміраваў каля паловы эканомікі. Для гэтага трэба аптымізаваць падатковыя льготы і стварыць простую і зразумелую сістэму.

Будаўніцтва магістраляў, бальніц, школ. Інвестыцыйныя праграмы павінны быць ад зямлі. У сілу вядомых абставін цяпер ва ўсяго свету на слыху тэма здабычы рэдказямельных матэрыялаў. Значыць, трэба ісці ў разведку. Для Мінпрыроды — у геалагічную, а Мінпрама — у экспартную. І ўсім у бой. Не толькі кіраўнікам. Намаганні прыкладаць трэба кожнаму беларусу. У адказе за сваю сям'ю, за прадпрыемства або цэлую галіну. А Першы — за нашу краіну.

Асаблівая ўвага — цэнам. Кошт пытання цэнаўтварэння — забеспячэнне сацыяльных стандартаў жыцця кожнага чалавека, а для Першага гэта пытанне нумар адзін. Адны за рынак, другія — за попыт, а Прэзідэнт — за справядлівасць.

Ва ўмовах «дзікага капіталізму» і пры рынкавым падыходзе — улада гэтай тэмай нават не пэцкаецца: маўляў, мы тут прычым? Але гэта не пра нашу краіну. Беларускі падыход — гэта стварэнне краіны роўных магчымасцяў. Менавіта такую палітыку і праводзіць Прэзідэнт. А цяпер уявіце, што было б, калі б не было такога Лукашэнкі. Але ён ёсць, і дзікага рынку ў нас няма. За гэта таксама галасавалі беларусы. Такія задачы пастаўлены перад новым складам урада.

Прычым для прэм'ера блізкая не толькі пазіцыя эканамічнага блока, але і вытворцаў. Вельмі дарэчы кіраўніцкі досвед на пасадзе губернатара Мінскай вобласці. Каб топ-кіраўнікі не адрываліся ад зямлі, а ведалі праблемы рэгіёнаў — мудрая кадравая канцэпцыя ракіровак Аляксандра Лукашэнкі. Без шокавых рашэнняў. Дарэчы, ва ўрадзе прафесіяналы з рознымі поглядамі і канцэпцыямі развіцця. Галоўнае — забяспечаны баланс.

Прызначэннем двух кіраўнікоў рэгіёнаў завершана фарміраванне новай каманды Прэзідэнта. У самыя перадавыя і нават, у нейкай меры, вобласці-канкурэнты — Мінскую і Гродзенскую — прызначаны губернатары. Аляксей Кушнарэнка — чалавек з энергетыкі і... дададзім энергіі цэнтральнаму рэгіёну. Прэзідэнт прызнаўся, што калі старанна падбіраў кіраўніка Міншчыны, то ўважліва вывучыў водгукі аб асобе і прафесійных якасцях Аляксея Кушнарэнкі. Мусіць, на характар паўплывала і працоўная дзейнасць: цяперашні губернатар пачынаў з нізоў кар'ернай лесвіцы і ўжо тады прывык, што вышыня галаву не закружыць — з электраманцёра дабраўся да кіраўніцкіх вышынь. Цяпер трэба будзе браць яшчэ і новыя вышыні, у тым ліку аграрныя.

Дарэчы, такі кадравы прынцып у Прэзідэнта: глядзець на самы пачатак біяграфіі, ці пакаштаваў кіраўнік рабочага хлеба, бо Беларусь — краіна для простага чалавека.

У час прызначэння кіраўнік дзяржавы заявіў, што на прыкладзе Гродзенскай і Мінскай абласцей хоча паглядзець, што атрымаецца, калі ў рэгіёны прыйшлі не спецыялісты менавіта ў аграрнай сферы. Юрый Караеў у прадстаўленні не мае патрэбы. Ні ўвогуле ў краіне, ні ў Гродзенскай вобласці ў прыватнасці. Тут ён апошнюю пяцігодку, не ў самыя спакойныя гады ў суверэннай гісторыі, адпрацаваў памочнікам Прэзідэнта — інспектарам па Гродзенскай вобласці.

У гэтым прызначэнні і мудрае рашэнне — балансу інтарэсаў — дзяржаўнай цэнтрычнасці, тут патрэбны чалавек са стрыжнем дзяржаўніка. Другі момант — сігнал сілавікам, верным прысязе — сваіх не кідаем. А патрыятычныя і прафесійныя кадры будуць прыносіць карысць дзяржаве і пасля службы ў пагонах. Юрый Караеў — верны салдат Прэзідэнта, які здольны прыдаць імпульс для інтэнсіўнай работы кадраў. Так што ў Панямонне вярнуўся літаральна генерал-губернатар, але цяпер гэта рэаліі сучаснай выключна незалежнай беларускай дзяржаўнасці. Цікава будзе паназіраць за спаборніцтвам паміж дзвюма абласцямі, якія даўно спрачаюцца за лідарства па многіх паказчыках. Узважаны, мудры баланс інтарэсаў — «залатое правіла» жыццёвай мудрасці беларускага свету.

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | ОАО «НКФО «Белинкасгрупп», г. Минск, ул. Либаво-Роменская, 23. УНП 807000270 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 **(www.ipmtorgi.by)** |

**Предмет электронного аукциона.**
Месторасположение: **г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 69**

| № лота | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, руб. |
|---|---|---|
| 1 | PEUGEOT EXPERT PRACTIK PR1610, AP 8134-7, 2010 г. в. | **14 853,58** |
| 2 | PEUGEOT EXPERT PRACTIK PR1610, AP 8128-7, 2011 г. в. | **14 854,99** |
| 3 | PEUGEOT EXPERT PRACTIK PR1610, AP 8105-7, 2011 г. в. | **14 912,76** |
| 4 | VOLKSWAGEN TRANSPORTER RUCAR, AI 3973-7, 2009 г. в. | **16 690,46** |
| 5 | PEUGEOT EXPERT PRACTIK PR1610, AP 9573-7, 2011 г. в. | **14 887,75** |
| 6 | VOLKSWAGEN TRANSPORTER, AP 8202-7, 2008 г. в. | **12 467,92** |
| 7 | VOLKSWAGEN TRANSPORTER, AP 8203-7, 2008 г. в. | **11 300,47** |

***Цена снижена на 30 %***

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета торгов перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ»; БИК BELBBY2X. Получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки». УНП 191 021 390

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 рабочих дней** после торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов** оплата должна быть произведена в течение **30 календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах**

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by). Соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона размещено на странице лота во вкладке «Документы». Победителем аукциона признаётся участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **4 %** от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения торгов

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» 21.01.2025

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до момента определения победителя торгов, без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 15.04.2025 с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 14.04.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35.**
**E-mail: auction@cpo.by**



ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
(организатор аукциона, г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321)
по поручению **РУП «Любанское ЖКХ»**
(продавец, г. Любань, ул. Ленина, 2, тел. 801794-68-7-06)
проводит открытый аукцион по продаже

**ИЗОЛИРОВАННОГО ПОМЕЩЕНИЯ**

**с инв. № 643/D-5515 общей площадью 50,2 кв. м (составные части и принадлежности – сарай), расположенного по адресу: Минская область, г. Любань, ул. Дзержинского, 9-2.**

**Сведения о земельном участке:**
**кадастровый номер – 623450100001002267, пл. – 0,1306 га.**
Начальная цена без НДС **– 34 900,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены **– 3 490,00** бел. руб.

Аукцион состоится **07.05.2025** в **12.00**
по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **05.05.2025** до **17.00** по указанному адресу **в каб. 320.**

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11.**
**Тел. для осмотра: (801794) 68-7-06; (8029) 395-94-975.**
**Информация о торгах опубликована на сайтах:**
**minsk-region.gov.by, rlt.by, gki.gov.by, rlt.by.**

УНП 600208822



**ЗАО «Центр промышленной оценки»** (УНП 191021390)
извещает о проведении повторных электронных торгов
в форме открытого аукциона по продаже

**автомобиля (suv universal)**
**GEELY EMGRAND X7, р/зн. 5-НЕ Т 9369.**

(местонахождение: Минская область, г. Логойск, ул. Советская, д. 15).

**Начальная цена без НДС – 9 810,00 бел. руб.** (снижена на 10 %).
Продавец имущества: Логойский районный исполнительный комитет.

**Оператор ЭТП:** ООО «ИПМ-Консалт оценка»,
г. Минск, ул. Немига 40, пом. 46, оф.1 **(www.ipmtorgi.by).**

**Дата и время начала и окончания электронных торгов:**
**с 11.00 до 11.10 18.04.2025.**
**Дата и время окончания приема заявок:** по **17.04.2025** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by.

Извещение о проведении электронных торгов опубликовано на сайтах Государственного комитета по имуществу и Минского облисполкома


САЦЫЯЛЬНЫ КЛОПАТ

# ЭКСПАНАТЫ ДАБРЫНІ

## Наталля КАЧАНАВА азнаёмілася з творчымі работамі дзяцей з расстройствамі аўтыстычнага спектра ўстаноў адукацыі і культуры Бярозаўскага раёна

Унікальная выстаўка экспануецца ў фае Савета Рэспублікі. Яна дае магчымасць паглыбіцца ў сямейную і сялянскую тэматыку, атрымаць асалоду ад прыгажосці беларускай прыроды, дакрануцца да тэмы Вялікай Перамогі. Тут і карціны з тканіны, і вышываныя палотны, і вязаныя цацкі, і тканыя паясы, і работы, валеныя з воўны, са шкла... Адметны, непаўторны погляд дзяцей на свет, якія па-асабліваму яго адчуваюць, нікога не пакідае раўнадушным.



Старшыня Савета Рэспублікі падрабязна азнаёмілася з экспанатамі, прадстаўленымі на выстаўцы, цікавілася лёсам таленавітых аўтараў. «У гэтых хлопцаў і дзяўчат унікальныя здольнасці, — звярнула ўвагу спікер. — Я заўсёды за тое, каб яны маглі рэалізаваць іх. Патрэбна зрабіць так, каб яны маглі і вучыцца, і працаваць».

Наталля Качанава адзначыла, што ў цэнтрах карэкцыйнага развіцця працуюць унікальныя людзі. «У такіх цэнтрах не могуць працаваць людзі, якія не любяць дзяцей, — лічыць спікер. — Там можа працаваць не кожны. Не кожны педагог і выхавальнік».

Старшыня Савета Рэспублікі праз сенатара Таццяну Ігнацюк, якая арганізавала выстаўку, выказала ўдзячнасць калектыву педагогаў і выхавацеляў, якія працуюць з асаблівымі дзецьмі. «Гэта вельмі цяжкая, але ўдзячная праца», — заўважыла Наталля Качанава.

Ад імя Старшыні Савета Рэспублікі дзецям, аўтарам экспанатаў выстаўкі, перададзены падарункі: прысмакі і наборы для творчасці. Да падрыхтоўкі падарункаў далучылася першасная прафсаюзная арганізацыя Савета Рэспублікі і першасная арганізацыя Беларускага саюза жанчын Савета Рэспублікі.

Як адзначыла ў размове з журналістамі **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, дырэктар Бярозаўскага раённага цэнтра карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі Таццяна ІГНАЦЮК**, на выстаўцы прадстаўлены работы хлопцаў і дзяўчат, якія вядуць нас за сабой у свет асаблівага дзяцінства. «Парог талерантнасці нашага беларускага народа пройдзены вельмі даўно і паспяхова, — удакладніла яна. — Мы ніколі не дзялілі нікога па нейкім прынцыпе, тым больш нашых дзяцей. Мы ўсе разумеем, што гэта нашы дзеці — самыя любімыя і родныя. Нашых хлопцаў і дзяўчат захапіць мастацтвам вельмі лёгка, бо хтосьці з іх не гаворыць, не піша, не чытае. Але выказвае свой унутраны свет менавіта з дапамогай мастацтва: стварае і паказвае гэтаму свету адкрытасць самога сябе».

Сенатар заўважае, што дзеці з расстройствамі аўтыстычнага спектра па-іншаму бачаць гэты свет. «Але запэўніваю (ведаю гэтых дзяцей шмат гадоў): гэты свет напоўнены найярчэйшымі фарбамі, якія для нас здаюцца часам не вельмі яркімі, — канкрэтызавала Таццяна Ігнацюк. — Гэты свет напоўнены вельмі прыгожымі гукамі, душой і шчырай любоўю да нас усіх. Нашы дзеці чытаюць нас, дарослых, як кнігу, а мы вучымся ў іх гэтаму цудоўнаму свету».

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

### Да ведама

10 красавіка 2025 г. Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Іванаўна Качанава правядзе асабісты прыём грамадзян, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, іх прадстаўнікоў і прадстаўнікоў юрыдычных асоб у г. Мінску (вул. Чырвонаармейская, 9).

Папярэдні запіс будзе ажыццяўляцца 3, 4 і 7 красавіка па тэлефонах: 8-017-222-66-94, 8-017-327-28-91.

# СВОЙ ШЛЯХ

## Узровень агульнага прагрэсу Беларусі па дасягненні Мэт устойлівага развіцця складае 80 %

Намеснік Старшыні Савета Рэспублікі, нацыянальны каардынатар па дасягненні Мэт устойлівага развіцця Сяргей Хаменка прымае ўдзел у рэгіянальным форуме ЕЭК ААН па ўстойлівым развіцці ў Жэневе.

— Мы ўсе розныя, і кожны народ, кожная краіна мае права на выбар свайго шляху развіцця. Рэспубліка Беларусь, краіна працаўнікоў і стваральнікаў, выбрала свой шлях. У яго аснове — захаванне гістарычнай памяці, мірнае суіснаванне, дзяржаўны суверэнітэт, развіццё тэхналогій, адзінства прадстаўнікоў больш як 150 нацый і нацыянальнасцяў, 25 рэлігійных канфесій, — адзначыў Сяргей Хаменка.

Ён дадаў, што на рэалізацыю гэтых прынцыпаў нацэлены ўсе галіны ўлады і беларускі ўнікальны орган народаўладдзя — Усебеларускі народны сход.

— Вынікам гэтай палітыкі з'яўляецца 30-е месца Беларусі ў свеце па дасягненні Мэт устойлівага развіцця. Па даных ААН, рэспубліка датэрмінова дасягнула чатырох з іх: ліквідацыя галечы, чыстая вада і санітарыя, памяншэнне няроўнасці, захаванне экасістэм сушы. Узровень агульнага прагрэсу складае 80 %, — заявіў нацыянальны каардынатар.

Ён акцэнтаваў увагу на тым, што Беларусь — сацыяльна арыентаваная дзяржава для чалавека і ў імя чалавека.

Віцэ-спікер Савета Рэспублікі прывёў некалькі паказчыкаў. Так, 43 % бюджэту краіны выдаткоўваецца на сацыяльную сферу, а ўзровень беспрацоўя складае толькі 3 %.

Парламентарый нагадаў, што ў Беларусі была пабудавана атамная электрастанцыя, краіна ўвайшла ў клуб касмічных дзяржаў, на тэрыторыю Беларусі забяспечаны бязвізавы ўезд для грамадзян са 101 дзяржавы, і падкрэсліў: «Гатовыя абменьвацца вопытам і паказваць свае дасягненні».

**— Як мудра адзначыў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка, мы глядзім за гарызонт, робім усё, каб нашы дзеці і ўнукі, а потым іх дзеці і ўнукі жылі ў сваёй мірнай і квітнеючай дзяржаве. У гэтым рэчышчы ўжо падрыхтаваны праект Нацыянальнай стратэгіі развіцця да 2040 года,** — падкрэсліў Сягрей Хаменка.

Паводле слоў парламентарыя, на шляху дасягнення прагрэсу наша краіна бачыць пагрозы і выклікі, якія перашкаджаюць устойліваму развіццю.

— Сёння свет знаходзіцца ў глыбокім геапалітычным крызісе. Маюць месца шматлікія ўзброеныя канфлікты, спробы ўмяшання ва ўнутраныя справы іншых дзяржаў, увядзенне незаконных санкцый, — акцэнтаваў увагу ён і прывёў красамоўныя прыклады. — На межах Беларусі знаходзіцца шматтысячная групоўка войскаў НАТА. Адкажыце, якая іх мэта? Сур'ёзнай пагрозай з'яўляюцца аднабаковыя прымусовыя меры, прасцей кажучы — санкцыі. І гэтыя бар'еры прымяняюць краіны, якія падпісалі Парадак-2030.

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

# АБАРОНА СПАЖЫЎЦОЎ І ЎЗМАЦНЕННЕ САЦЫЯЛЬНЫХ ГАРАНТЫЙ

## Дэпутаты прынялі змяненні ў заканадаўства аб рыэлтарскай дзейнасці і пытаннях падаткаабкладання

Адкрываючы чарговае пасяджэнне другой сесіі Палаты прадстаўнікоў, Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА нагадаў, што 25 сакавіка дэпутаты сталі сведкамі і ўдзельнікамі падзеі гістарычнай значнасці. Інаўгурацыя Прэзідэнта Рэспублікі, па яго словах, азнаменавала сабой завяршэнне працэсу маштабных грамадска-палітычных пераўтварэнняў — краіна ўступіла ў новы этап свайго развіцця.



### РАШЭННІ, ЯКІЯ ІДУЦЬ АД ЖЫЦЦЯ

Спікер звярнуў увагу, што аблічча сучаснай Беларусі найлепш дэманструе эфектыўнасць выбранага курсу, які дазволіў дзяржаве захаваць сацыяльна арыентаваную эканоміку. «Як адзначыў Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка, наша перамога — гэта новы гістарычны шанц, магчымасць зрабіць яшчэ больш на карысць роднай Беларусі, — канстатаваў Ігар Сергяенка. — Абазначаны ключавыя контуры той стратэгіі, якую трэба будзе рэалізаваць у найбліжэйшай будучыні. Прынцыповае патрабаванне, якое задае тон рабоце ўсіх органаў улады і кіравання на будучую пяцігодку, — набраць такую моц, каб хапіла зараду на доўгую дыстанцыю».

Ігар Сергяенка нагадаў, што ў цяперашнім складзе Палата прадстаўнікоў працуе ўжо год. Праведзена 28 пасяджэнняў Палаты прадстаўнікоў, у тым ліку пяць сумесных з Саветам Рэспублікі. Прынята 65 законаў.

«Асаблівую цікавасць для грамадзян уяўляе новая рэдакцыя Закона «Аб дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёю», — канкрэтызаваў спікер. — Яна дазваляе аператыўна рэгістраваць здзелкі з нерухомасцю незалежна ад месцазнаходжання, павысіць дакладнасць звестак, уключаных у дзяржаўны рэгістр. Сур'ёзную дапамогу сельскагаспадарчым арганізацыям акажуць папраўкі ў Закон «Аб дарожным руху», якія пашыраюць магчымасць прыцягнення моладзі да кіравання трактарамі і самаходнымі машынамі. Усё гэта прыклады заканадаўчых рашэнняў, якія ідуць ад жыцця, ад зямлі, што пастаянна патрабуе ад парламентарыяў кіраўнік дзяржавы».

Многае робіцца і ў плане павышэння пазнавальнасці дэпутатаў у акругах. «Аўтарытэт зарабляецца канкрэтнымі справамі і залежыць у тым ліку ад таго, як вырашаюцца пытанні, якія ўздымаюцца нашымі выбаршчыкамі, — падкрэсліў Ігар Сергяенка. — І вядома, як выконваюцца абяцанні дэпутатаў, дадзеныя ў ходзе сваёй перадвыбарнай кампаніі. Трэба яшчэ раз уважліва папярэдне на свае праграмы і дасягаць іх безумоўнага выканання».

Непасрэдны абавязак дэпутацкага корпуса, як адзначыў спікер, — зберагчы стваральны след у гісторыі: наш і нашых папярэднікаў. У год 80-годдзя Вялікай Перамогі гэта задача, па яго словах, набывае асаблівае гучанне. У канцы красавіка ў Валгаградзе пад эгідай Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі адбудзецца міжнародны патрыятычны форум «Вялікая спадчына — агульная будучыня». Спікер падкрэсліў, што гэта не шараговае мемарыяльнае мерапрыемства, а дэманстрацыя свету тых ідэалаў і каштоўнасцяў, якія мы сёння абараняем. У гэтай сувязі пастаўлена задача — адказна падысці да падрыхтоўкі і ўдзелу ў гэтым мерапрыемстве.

«Задачы перад намі стаяць маштабныя, і аб'ём іх будзе толькі нарастаць, — рэзюмаваў Ігар Сергяенка. — Пераканаsucc, Палата прадстаўнікоў унясе годны ўклад у тое, каб Беларусь, нягледзячы на ўсе спробы звонку аслабіць нас, заставалася моцнай, пазнавальнай і паважанай у свеце краінай».

### ЗАКАНАДАЎЧЫ АДКАЗ НА ЗАРОБКІ Ў КАНВЕРТАХ

У другім чытанні прыняты законапраект «Аб рыэлтарскай дзейнасці». Скасоўваецца інстытут агентаў па аперацыях з нерухомасцю. Правам аказання рыэлтарскіх паслуг будуць валодаць толькі рыэлтары, якія з'яўляюцца членамі Палаты рыэлтараў і маюць пасведчанне, выдадзенае Міністэрствам юстыцыі па выніках здачы экзамену.

«Пашыраны магчымасці рыэлтарскіх арганізацый па атрыманні інфармацыі: напрыклад, цяпер можна будзе звярнуцца ў архіў для атрымання звестак аб заключэнні або скасаванні шлюбу, — канкрэтызавала **член Пастаяннай камісіі па жыллёвай палітыцы, гандлі і будаўніцтве Палаты прадстаўнікоў Алена ХІЛЯ.** — Таксама рыэлтарам неабходна мець профільную адукацыю. Абавязковай умовай для ўсіх рыэлтараў будзе праходжанне атэстацыі і атрыманне пасведчання аб атэстацыі».

Адразу ў двух чытаннях прыняты законапраект «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб змяненні законаў па пытаннях падаткаабкладання». Як патлумачыла **член Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Палаты прадстаўнікоў Наталля КУЛЯШОВА**, з 2025 года індывідуальным прадпрымальнікам забаронена працаваць у гэтым статусе, калі іх сукупны гадавы даход або выручка па выніках 2024 года перавысілі 500 тысяч беларускіх рублёў.

«Па інфармацыі Міністэрства па падатках і зборах, у 1664 індывідуальных прадпрымальнікаў сукупны гадовы даход перавышаны, — праінфармавала дэпутат. — Згодна з дзеючым заканадаўствам, яны павінны былі ўзбуйніць свой бізнес, перарэгістравацца ў юрыдычную асобу або спыніць сваё існаванне. Большасць з іх перарэгістраваліся ў юрыдычныя асобы, але для 660 індывідуальных прадпрымальнікаў яшчэ існуе нявызначанасць».

У законапраекце, прынятым раней, не быў вызначаны часавы прамежак, на працягу якога грамадзянін не можа займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю ў статусе індывідуальнага прадпрымальніка. Цяпер гэты перыяд устанаўліваецца ў тры каляндарныя гады.

У першым чытанні дэпутаты разгледзелі праект Закона Рэспублікі Беларусь «Аб змяненні законаў па пытаннях дзяржаўнага сацыяльнага страхавання і пенсіённага забеспячэння». У прыватнасці, удакладняюцца катэгорыі грамадзян, якія падлягаюць абавязковаму дзяржаўнаму страхаванню.

Як адзначыла **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях Палаты прадстаўнікоў Святлана СЕНЬКА**, навеўвядзенні закранулі і работадаўцаў, якія выплачваюць заработную плату ў канвертах, а таксама работнікаў, якія атрымліваюць заробкі ў канвертах: у выпадку ўстанаўлення выплаты заработнай платы ў канверце работадавец абавязаны будзе даналічыць узносы ў бюджэт фонду з фактычных выплат. Навацыя дазволіць не столькі спагнаць больш узносаў у работадаўца, колькі папярэдзіць негатыўныя факты і забяспечыць сацыяльныя гарантыі грамадзянам».

Акрамя таго, дэпутатамі ратыфікаваны шэраг міжнародных дакументаў.



**Вераніка КАНЮТА.**

**Фота БелТА.**


Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор электронных торгов** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607. УНП 191021390 (www.cpo.by) |
| **Продавец** | ОАО «Газпром трансгаз Беларусь», г. Минск, ул. Некрасова, 9. УНП 100219778 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом.1703, оф. 5 (**www.ipmtorgi.by**) |

**Предмет электронных торгов: имущество, бывшее в употреблении**

| № лота | Наименование | Начальная цена с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | **Блок-модуль БК-21** (инв. № 100000041738), 2002 г. в. | **3 120,00** |
| 2 | **Блок-модуль БК-22** (инв. № 100000041739), 2002 г. в. | **3 120,00** |
| 3 | **Грузовой специальный фургон изометрический ГАЗ 3302 «БелАВА 1220»,** AI 3564-2, 2013 г. в. | **15 000,00** |
| 4 | **Легковой внедорожник универсал УАЗ 3163-344 Патриот**, 3939ЕВ-2, 2011 г. в. | **8 280,00** |

**Месторасположение:** лоты №№ 1, 2 – Могилевская обл., Осиповичский р-н, Лапичский с/с, д. Лапичи, лоты №№ 3, 4 – Витебская область, д. Селище

***Условия проведения торгов:*** если на аукцион зарегистрировался один участник, предмет торгов продается данному участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %, при наличии двух и более участников шаг аукциона составляет 1 % от начальной цены лота

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО Банк БелВЭБ (г. Минск), БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять)** рабочих дней после электронных торгов |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов** | **10 (десять)** рабочих дней после подписания договора купли-продажи |

**Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5%, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение 4 % от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звязда»: лоты №№ 1, 2 – от 18.09.2024, лоты №№ 3, 4 – 05.06.2024

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | Начало торгов в 11.00 **15.04.2025**. Окончание торгов в 12.00 **15.04.2025**. Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | Заявки на участие в электронных торгах принимаются по **14.04.2025** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by |

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35. E-mail: auction@cpo.by**



Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | Гражданин Республики Беларусь Крутько С.М. |
| **Оператор / Адрес ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, 40, пом. 46, оф. 1. **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов:**

**здание башни водонапорной**

(сооружение специализированное водохозяйственного назначения), инв. номер 631/С-68416, общая площадь 40 кв. м, по адресу: Минская обл., Вилейский р-н, г. Вилейка, ул. Гагарина. Составные части и принадлежности: подвал. Сведения о земельном участке с кадастровым номером 621350100007002029: предоставлен на праве аренды по 25.05.2028 г. для обслуживания водонапорной башни

**Начальная цена без НДС – 17 990,00 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета торгов перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО Банк БелВЭБ, БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих** дней со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** в течение **10 (десяти) календарных** дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить затраты организатору торгов на их проведение, также оплатить организатору торгов установленное вознаграждение **6 %** от цены продажи лота в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 12.00 19.05.2025.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 16.05.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35. E-mail: auction@cpo.by**

**ООО «Деловая оценка»** (организатор аукциона)
по поручению **Речицкого РайПО** (продавец)
извещает о проведении **15 апреля 2025 года**
открытого повторного аукциона
по продаже имущества **в 12.00** по адресу:
г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

| |
|---|
| **Лот № 1:** капитальное строение инв. № 340/С-3202682 площадью 764,4 кв. м, назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 324581602101000179 площадью 0,1931 га по адресу: Гомельская обл., Речицкий р-н, Борщёвский с/с, д. Борщёвка, ул. Советская, 41А. Составные части и принадлежности: две кирпичные пристройки, пристройка из газосиликатных блоков, два склада, два сарая, навес, погреб, ограждение. Лот включает оборудование в количестве 43 ед. |
| **Начальная цена** продажи без НДС – 94 860,00 бел. руб. **Задаток** – 948,60 бел. руб. |
| **Лот № 2:** капитальное строение инв. № 340/С-3204616 площадью 128,8 кв. м, назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание магазина, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 324584404101000013 площадью 0,0303 га по адресу: Гомельская обл., Речицкий р-н, Защёбьевский с/с, д. Макановичи, ул. Школьная, 101. Составные части и принадлежности: кирпичная пристройка |
| **Начальная цена** продажи без НДС – 12 420,00 бел. руб. **Задаток** – 124,20 бел. руб. |
| **Лот № 3:** капитальное строение инв. № 340/С-3204621 площадью 88,9 кв. м, назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание магазина № 37, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 324585406601000007 площадью 0,0471 га по адресу: Гомельская обл., Речицкий р-н, Коровrouteтичский с/с, д. Тишковка, ул. Советская, 6. Составные части и принадлежности: пристройка из блоков газосиликатных |
| **Начальная цена** продажи без НДС – 11 250,00 бел. руб. **Задаток** – 112,50 бел. руб. |

**Продавец: Речицкое РайПО**, г. Речица, ул. Привокзальная, д. 2. Конт. тел.: +375 232 34-98-92, +375 33 643-43-14.

**Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»: BY60BELB30121322650030226000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, пр-т Ленина, 10, БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и с **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 14.04.2025 г. в 17.00.**

Порядок участия и проведения аукциона с перечнем необходимых документов опубликован на сайте **www.deloocenka.by**

**Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения.** Единственный участник имеет право приобрести лот с шагом 5 %. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; стоимость, сформированная в результате аукциона, должна быть выплачена продавцу в течение **30 (тридцати) календарных дней** с момента проведения торгов. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости предмета оценки. Указанные объекты никому другому не проданы, не заложены, под запретом не состоят, судебного спора о них не имеется, других владельцев нет. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

**Конт. тел. организатора аукциона:**
**+375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62.**

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
(организатор аукциона) по поручению
**Отдела идеологической работы, культуры и по делам молодежи Стародорожского районного исполнительного комитета** (продавец)
**проводит открытый аукцион**

**по продаже изолированного помещения с инв. № 645/D-5523 (наименование – детская библиотека)**

**общей площадью 136,5 кв. м, расположенного по адресу: Минская область, Стародорожский район, г. Старые Дороги, ул. Пушкина, 1-2**.
Начальная цена без НДС – **54 700,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **5 470,00** бел. руб.

Аукцион состоится **07.05.2025** в **14.00**
по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **05.05.2025** до **17.00** по указанному адресу **в каб. 320.**

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8044) 789-10-18, (8029) 136-31-11.**

УНП 690727164

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
(организатор аукциона)
**по поручению Управления по образованию, спорту и туризму Стародорожского районного исполнительного комитета** (продавец)
**проводит открытый аукцион**

**по продаже изолированного помещения с инв. № 645/D-4595 (наименование/назначение – помещение, не относящееся к жилищному фонду)**

**общей площадью 705,8 кв. м, расположенного по адресу: Минская область, Стародорожский район, г. Старые Дороги, ул. Кирова, 68Б-1**.
Начальная цена без НДС – **262 000,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены **– 26 200,00** бел. руб.

Аукцион состоится **07.05.2025** в **14.00**
по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **05.05.2025** до **17.00** по указанному адресу **в каб. 320.**

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8044) 789-10-18, (8029) 136-31-11.**

УНП 690727164

# СПРАВЯДЛІВЫ ПАДЫХОД

## Падпісана пастанова № 713 (6), якая прадугледжвае карэкціроўку сістэмы рэгулявання цэн

Як паведамілі ў прэс-службе ўрада, падпісана новая рэдакцыя вядомай пастановы Саўміна № 713 «Аб сістэме рэгулявання цэн», якая з'явілася ў 2022 годзе ў адказ на істотны рост інфляцыі.

На той момант дакумент меў шэраг мер і абмежаванняў, ён дазволіў не дапусціць імклівага росту цэн і стрымаць інфляцыю ў прагнозных значэннях. На працягу часу палажэнні дакумента зведалі шэраг змяненняў, накіраваных на ўдасканаленне механізму цэнавага дзяржрэгулявання, сутнасць якіх заўсёды зводзілася да аднаго — справядлівага цэнаўтварэння для ўсіх удзельнікаў рынку: вытворцаў, гандлёвых сетак і спажыўцоў.



У Саўміне растлумачылі, што цяперашнія змены закрануць як вытворцаў, так і суб'ектаў гандлю. Ключавая мэта змяненняў — павышэнне фінансавай устойлівасці айчынных вытворцаў, ліквідацыя адміністрацыйных бар'ераў узгаднення цэн.

***Больш падрабязна аб навацыях дакумента раскажам у найбліжэйшых нумарах.***

# ПЕРШЫЯ ГРОШЫ

## Як можна зарабіць падлетку, распавялі ў Мінпрацы і сацабароны

У профільным міністэрстве нагадалі, што працаваць падлеткі могуць у вольны ад вучобы час пачынаючы з 14 гадоў (але ёсць умова: рабіць гэта можна з пісьмовай згоды аднаго з бацькоў). А вось з 16 гадоў такое рашэнне можна прымаць самастойна.



Другая ўмова для працы падлетка — скарочаная працягласць працоўнага часу. Ад 14 да 16 гадоў — гэта не больш за 23 гадзіны на тыдзень (падчас канікул — не больш за 4 гадзіны 36 хвілін на дзень і выконваць толькі лёгкія працоўныя задачы); ад 16 да 18 гадоў — не больш за 35 (7 гадзін).

Таксама забаронена прыцягваць дзяцей да начных і звышурочных, работ у святочныя і выхадныя дні.

Дарэчы, усе асобы, маладзейшыя за 18 гадоў, прымаюцца на працу толькі пасля медагляду.

Што датычыцца аплаты, то памер налічанай заработнай платы за цалкам адпрацаваны месяц не павінен быць меншым за мінімальную заработную плату, якая сёння складае 726 рублёў.

**У тэму**

### Як зразумець, якая прафесія падыходзіць менавіта табе?

**Лічбавы сэрвіс «Крок у прафесію» дапаможа вызначыцца з выбарам кар'ернага шляху.**

Як растлумачылі ў Мінпрацы і сацабароны, тэсты сэрвісу дапамогуць вызначыцца з прафесіямі, якія падыходзяць; зразумець, ці адпавядае яна вам; выбраць прафесію, калі не ведаеш, якую хочаш.

Дарэчы, усе тэсты бясплатныя.

У профільным ведамстве дадалі, што сэрвіс дазваляе не толькі вызначыць сферу інтарэсаў, ацаніць, наколькі чалавек падыходзіць абранай прафесіі, але і вывучыць запатрабаванасць на рынку працы.

Адзначым, што тэсціраванне можна прайсці ананімна, гэта значыць, без рэгістрацыі, на партале дзяржаўнай службы занятасці.

У завяршэнне варта сказаць, што вынік тэсціравання будзе карысны не толькі выпускнікам.

— Нават чалавеку з вялікім вопытам у прафесіі цікава будзе даведацца, ці правільна ў свой час абрана сфера дзейнасці, — запэўнілі ў Мінпрацы.




# ВЫБАР — БЕЛАРУСКАЯ «МАЛОЧКА»

## На БУТБ акрэдытавалася першая кампанія з М'янмы

Новы ўдзельнік таргоў плануе купляць беларускую малочную прадукцыю, распавялі на біржы, адзначыўшы, што, такім чынам, спіс краін, якія выкарыстоўваюць біржавы механізм для гандлю з Беларуссю, пашырыўся да 82 дзяржаў.

Пры гэтым Паўднёва-Усходнюю Азію прадстаўляюць пяць краін: В'етнам, Інданезія, Малайзія, М'янма і Сінгапур.

— Практычна ўсе кампаніі з Паўднёва-Усходняй Азіі акрэдытаваліся ў апошнія чатыры месяцы для набыцця на біржы малочнай прадукцыі, — дадалі на БУТБ.

Тут растлумачылі, што найбольш актыўныя ўдзельнікі з Сінгапура: за мінулы год сума заключаных імі здзелак вырасла ў 1,6 раза, да 28 мільёнаў долараў. Увесь аб'ём забяспечыў імпарт беларускіх піламатэрыялаў, цэлюлозы і сухога малака.

За перыяд з пачатку бягучага года біржавы тавараабарот Беларусі і Сінгапура склаў 13,6 мільёна долараў — у 5,2 раза больш, чым за першы квартал мінулага года.

Дарэчы, цяпер на БУТБ акрэдытаваны 8246 замежных удзельнікаў, у тым ліку 10 з Сінгапура і па адным з В'етнама, Інданезіі, Малайзіі і М'янмы.

# АДКРЫТА І ДАСТУПНА

## Беларуская дэлегацыя прадставіла справаздачу аб палітыцы ў сферы абыходжання з радыеактыўнымі адходамі і адпрацаваным ядзерным палівам



Беларусь у поўнай меры выконвае ўзятыя на сябе абавязацельствы ў рамках Аб'яднанай канвенцыі аб бяспецы абыходжання з адпрацаваным палівам і бяспецы абыходжання з радыеактыўнымі адходамі, паведамілі ў Мінэнерга.

У рамках восьмай агляднай нарады дагаворных бакоў канвенцыі, якая праходзіла ў Вене з 17 да 28 сакавіка, наша краіна прадставіла нацыянальны даклад, у якім адлюстраваны ключавыя кірункі палітыкі ў сферы абыходжання з радыеактыўнымі адходамі і адпрацаваным ядзерным палівам, меры і дасягнуты прагрэс па выкананні прапаноў папярэдняй нарады.

Было адзначана, што краіна выканала ўсе ключавыя задачы ў справаздачным перыядзе, прадстаўлены асноўныя вынікі праведзенай работы па развіцці заканадаўчай і нарматыўна-прававой базы, фарміраванні сістэмы кіравання радыеактыўнымі адходамі і яе навукова-тэхнічным забеспячэнні, удасканаленні інфраструктуры ядзернай і радыяцыйнай бяспекі і яе кампанентаў, умацаванні кадравага патэнцыялу. Асаблівая ўвага аддадзена функцыяналу і задачам створанага ў краіне нацыянальнага аператара па абыходжанні з РАА — дзяржаўнага прадпрыемства «БелРАА», этапам планаванага да рэалізацыі праекта па ўзвядзенні рэспубліканскага пункта пахавання радыеактыўных адходаў.

Па выніках абароны было адзначана, што Беларусь адлюстравала ў прэзентацыі даклада ўсе актуальныя аспекты і дала вычарпальныя адказы на зададзеныя пытанні.

УРАЖАННІ

# «САПРАЎДНЫ ЦУД!»

## Работнікі сферы ЖКГ наведалі Палац Незалежнасці

**Першая экскурсія пасля цырымоніі інаўгурацыі Прэзідэнта прайшла ў Палацы Незалежнасці 2 красавіка. Штогод у чацвёртую нядзелю сакавіка ў краіне адзначаецца прафесійнае свята работнікаў жыллёва-камунальнай гаспадаркі. І вось у якасці падарунка 120 прадстаўнікоў галіны з Мінска і Любані змаглі на свае вочы ўбачыць рэзідэнцыю Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

Большасць гасцей бачылі Палац Незалежнасці толькі па тэлевізары. Ці супалі іх чаканні з рэальнасцю? Мы заспелі намесніка дырэктара па сацыяльных пытаннях і рабоце з насельніцтвам КУП ЖКГ Ленінскага раёна горада Мінска Вікторыю Саўлевіч за напісаннем цёплых слоў у гасцявой кнізе. Яна таксама з задавальненнем падзялілася і з намі сваімі ўражаннямі.

— Рэзідэнцыя проста грандыёзная! Усё зроблена на вельмі высокім узроўні рукамі нашых беларускіх умельцаў, таму я лічу, што такія экскурсіі — магчымасць далучыцца да культуры, творчасці, рукадзелля нашых майстроў. Сапраўдны цуд — тое, што ўся гэтая прыгажосць акумулявана ў адным будынку! — падзялілася яна.

З цікавасцю інтэр'ер Палаца Незалежнасці аглядала і намеснік дырэктара па сацыяльных пытаннях і рабоце з насельніцтвам КУП ЖКГ Партызанскага раёна горада Мінска Таццяна Осікава. Паводле яе слоў, іх арганізацыя даўно чакала магчымасці трапіць сюды на экскурсію.

— Такі падарунак нас вельмі ўзрадаваў. Прыемныя эмоцыі ад наведвання Палаца Незалежнасці складана перадаць словамі. Гонар за краіну перапаўняе. Мы вельмі ўдзячныя за тое, што нам пашчасціла ўбачыць усю гэтую прыгажосць на свае вочы, — адзначыла яна.

Падзяліўся ўражаннямі і начальнік аддзела эканомікі прадпрыемства «Гаррамаўтадар Мінгарвыканкама», дэлегат УНС Дзмітрый Гайдук. Паводле яго слоў, уся атмасфера Палаца Незалежнасці прасякнута веліччу.

— Гэта не можа перадаць тэлевізійная выява. Калі трапляеш у гэтую прастору, перад вачыма праносяцца розныя важныя падзеі, якія адбываліся тут, і гэта неверагодна, бо ў такія моманты адчуваеш сваё дачыненне да гісторыі, — сказаў ён.

Госці паглыбляліся ў аповеды аб стварэнні Палаца Незалежнасці, аб тых грандыёзных падзеях і сустрэчах, якія праходзілі ў гэтых сценах, разглядалі розныя экспанаты і, вядома ж, рабілі фота на памяць. Праўду кажуць, што найлепшы падарунак — гэта добрыя эмоцыі, а яны з гасцямі рэзідэнцыі застануцца надоўга.

**Лізавета ГОЛАД,**
**фота аўтара.**
















**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор аукциона)
извещает о проведении повторного
открытого аукциона по продаже имущества
**ОАО «Криница»** (Продавец)

**Аукцион состоится 7.05.2025 в 11.00 по адресу:**
**г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4.**

**Лот № 1, состав:**

1. Контрольный пост и проходная, инв. № 621/С-1161, 66,5 кв. м.
2. Здание подсобного блока, инв. № 621/С-1163, 1138,5 кв. м.
3. Помещение мойки пивовозов, инв. № 621/С-1164, 113,6 кв. м.
4. Насосная станция над артскважиной, инв. № 621/С-1166, 50,1 кв. м.
5. Здание насосно-фильтровальной станции, инв. № 621/С-1168, 254,6 кв. м.
6. Сушильный цех, инв. № 621/С-1170, 264,2 кв. м.
7. Административное здание, инв. № 621/С-1171, 322,3 кв. м.
8. Здание главного корпуса, инв. № 621/С-1172, 4055,3 кв. м.
9. Сооружение площадка для стеклобоя, инв. № 621/С-3617, 111,6 кв. м.
10. Здание котельной, инв. № 621/С-17178, 517 кв.м.
11. Внеплощадочные и площадочные сети водопровода, инв. № 621/С-20589, 2994 м.
12. Кабельная ЛЭП, инв. № 621/С-20588, 1196,7 м.
13. Внеплощадочные и площадочные сети канализации, инв. № 621/С-20587, 2462,2 м
14. Низковольтные сети промплощадки, инв. № 621/С-20586, 3028 м.
15. Площадочные тепловые сети, инв. № 621/С-20584, 393 м.
16. Сети газопровода, инв. № 621/С-20581, 248 м.
17. Артскважина с насосом ЭВЦ 10х63-110, инв. № 621/С-1028912.
18. Благоустройство (проезды, площадки, ограждения), инв. № 621/С-1029402, площадь – 11366,0 кв. м.
19. Резервуар промывочной воды, инв. № 621/С-1029401, площадь – 27,0 кв. м.
20. Резервуар фильтрованной воды V 500 куб., инв. № 621/С-1029400, площадь – 148,3 кв. м.
21. Резервуар фильтрованной воды V 500 куб., инв. № 621/С-1029399, площадь – 151,5 кв. м.
22. Движимое имущество (перечень на электронной торговой площадке «GOSTORG»(gostorg.by)).
23. Объекты растительного мира (перечень на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by)).

**Адрес** Лота № 1: Минская обл., Несвижский р-н, г. Несвиж, ул. Кутузова, 7; 7/5; 7/2; 7/1; 7/4; 7/9; 7/8; 7/7; 7/6.

**Артскважина:**
Минская обл., Несвижский р-н, Несвижский с/с, 11.

**Начальная цена** с НДС 20 % – 3 777 759,14 руб.
Задаток – 200 000,00 руб.
Земельные участки: 1. 624250100001000118, 5,2100 га;
2. 624250100001000119, 0,3600 га.
Право постоянного пользования.
**Шаг аукциона** – 5 %.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, определения лица, выигравшего аукцион, а также условия аукциона содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by).

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений и задатков: **05.05.2025 в 11.00.**

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182



**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении электронных торгов
по продаже имущества, принадлежащего
**ОАО «Оптово-логистический центр «БелТекс»**
(Продавец).

**Электронные торги состоятся 06.05.2025.**

**Лот № 1:**
**Г 1/К ЗДАНИЕ МАГАЗИНА «НЕЛЛИ»**
с инв. № 500/С-3583, площадь: 461,0 кв. м.

Адрес: г. Минск, ул. Платонова, 32.
Начальная цена с НДС 20 % – 1 507 000,00 руб.
Задаток – 150 700,00 руб.

Обременения: договоры аренды.

Капитальное строение с инв. № 500/С-3583 расположено на земельном участке 500000000009001893, площадь: 0,4819 га. Право постоянного пользования. Доля: 1/1.

На земельном участке расположены иные объекты, которые не выставлены на электронные торги. Переход права на земельные участки осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

**Шаг электронных торгов** – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).

Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **02.05.2025 в 16.00.**

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52,**
**torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182




ГЭТЫ ДЗЕНЬ МЫ НАБЛІЖАЛІ ЯК МАГЛІ

# СКІДЗЕЛЬ. МУЖНАСЦЬ МАЛАДЫХ ПАТРЫЁТАЎ

## Горад памятае подзвіг сваіх абаронцаў і землякоў

У тым, што Скідзель удастоены вымпела «За мужнасць і стойкасць у гады Вялікай Айчыннай вайны», ёсць і заслуга камсамольцаў-падпольшчыкаў. Восем з іх загінулі ў барацьбе з акупантамі і пасмяротна ўзнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені. Горад памятае іх подзвіг. Іх імёны носяць вуліцы Скідзеля, і кожны год 13 верасня каля мемарыяла праходзіць урачысты мітынг у гонар маладых герояў.





### ПАСЛЯ НАЧНОГА БОЮ...

Скідзель вызвалены 13 ліпеня 1944 года. Кропка была пастаўлена а 13-й гадзіне. Гэтай доўгачаканай падзеі папярэднічаў складаны начны бой перадавога атрада 50-й арміі з часцямі гітлераўцаў, якія адступалі з-пад Ліды. Некалькі разоў атака пераходзіла ў рукапашны бой. На подступах да горада былі знішчаны звыш 700 нямецкіх акупантаў. Значныя страты панеслі і савецкія ваенныя падраздзяленні.

У гарадскім парку ў брацкай магіле пахаваны 1 138 воінаў і партызан, з іх чатыры — Героі Савецкага Саюза. Яны загінулі падчас баёў на тэрыторыі тады яшчэ Скідзельскага раёна. Таксама сюды перавезены астанкі ўдзельнікаў Скідзельскага паўстання 1939 года. На памятнай дошцы ўвекавечаны імёны мясцовых жыхароў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Асобныя ўшанаванні тут аддаюць васьмі маладым падпольшчыкам. У іх гонар у рамках праекта «Памяць. Адзінства. Перамога» некалькі гадоў таму ўстаноўлена восем інтэрактыўных таблічак з QR-кодам, дзе можна азнаёміцца з біяграфіяй і гісторыяй подзвігу кожнага героя. У музеі СШ № 3 Скідзеля камсамольцам-падпольшчыкам прысвечана асобная экспазіцыя.

### ТАРАН НАД СКІДЗЕЛЕМ

Немцы ўвайшлі ў горад 26 чэрвеня 1941 года. Каля двух сутак іх стрымлівалі курсанты пагранічнай школы і часці ваенна-паветраных сіл.

Дзяжурная эскадрылля, як звычайна, паднялася ў неба 22 чэрвеня да ўсходу сонца. Лётчыкі не ведалі, што пачалася вайна. Над Гроднам яны ўбачылі шматлікія самалёты ворага і зразумелі, што адбываецца. Эскадрылля ўступіла ў бой і збіла тры варожыя самалёты. Лётчыкі прынеслі на аэрадром страшную вестку...

У першы дзень авіяполк здзейсніў 180 баявых вылетаў і збіта 20 самалётаў праціўніка. Але страцілі 13 сваіх знішчальнікаў. Як расказаў **старшыня Савета ветэранаў горада Скідзеля Васіль КАЗАК**, менавіта тут упершыню былі праведзены тры паветраныя тараны. Два пілоты загінулі, адзін змог пасадзіць самалёт на полі. Палітруку Андрэю Данілаву было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Пасля вайны ён наведваў горад і месца свайго подзвігу.

Скідзель больш за тры гады знаходзіўся пад акупацыяй немцаў. У раёне ад рук фашыстаў загінулі і былі вывезены ў Германію звыш 14 тысяч чалавек. На тэрыторыі былога ваеннага гарадка немцы зладзілі яўрэйскае гета.

Але горад не здаваўся. Праз некалькі месяцаў, у верасні 1941 года, камсамольцы арганізавалі падпольную групу. Яна дзейнічала роўна год, але памяць аб маладых патрыётах перажыла не адно пакаленне.

### НЕ СКАРЫЛІСЯ ВОРАГУ



Падпольная група паступова набірала сілу. Моладзь расклейвала лістоўкі, якія сама пісала. Перадавала партызанам важныя звесткі, адзенне і здабытую зброю. У 1942 годзе сумесна з байцамі партызанскага атрада разграмілі нямецкі гарнізон у вёсцы Азеры і вызвалілі людзей з гета, многія з якіх пайшлі разам з партызанамі.

Але ў давер да маладых патрыётаў увайшоў адзін з тайных агентаў гестапа. У пачатку верасня 1942 года правакатарам былі выданы восем камсамольцаў. Іх імёны добра ведаюць скідзяльчане. Гэта Аляксей Ролік, Іван Шчасны, Фёдар Макарчук, Іван Сяўрук, Анатоль Зелянкоўскі, Мікалай Дзелянкоўскі, Іван Сініца і Уладзімір Кізевіч. З іх толькі апошні быў паўналетнім, меў сям'ю і працаваў на чыгунцы. Самаму малодшаму Аляксею Ролiку споўнілася 15 гадоў.

Камсамольцаў арыштавалі 4 верасня, чатыры дні немцы дапытвалі аб сувязях з партызанамі, затым павезлі ў гродзенскую турму. Але ніхто з іх не выдаў ні партызан, ні сваіх таварышаў. У гэты час іншыя ўдзельнікі групы, што былі на свабодзе, падпалілі ў акрузе скляпы са збожжам, якое немцы падрыхтавалі для вывазу ў Германію.

А 13 верасня немцы ўстанавілі на цэнтральнай плошчы горада шыбеніцы, сагналі сюды жыхароў Скідзеля і навакольных вёсак, каб зрабіць пакаранне смерцю публічным. Ніводзін з хлопцаў не прасіў літасці. Так здарылася, што ў двух юнакоў абарваліся вяроўкі. Звычайна пры такім раскладзе прыгавор змякчаецца, але іх фашысты вывезлі за горад і расстралялі. Там яны і пахаваны. Астатнія шасцёра яшчэ некалькі дзён віселі для запалохвання местачкоўцаў. Затым іх целы адвезлі ва ўрочышча Бор і закапалі ў агульнай магіле. На гэтым месцы ў 1990 годзе адкрыты новы мемарыяльны комплекс. У гарадскім цэнтральным парку, дзе стаялі шыбеніцы, устаноўлены помнік, а на таблічках з QR-кодамі можна даведацца аб іх кароткім жыцці і подзвігу. Усе восем герояў пасмяротна ўзнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені.

На працягу многіх гадоў 13 верасня адзначаецца як Дзень памяці скідзельскіх камсамольцаў-падпольшчыкаў. Штогод у гэты дзень да помніка ў цэнтры горада прыходзяць новыя пакаленні гараджан, каб яшчэ раз успомніць юных герояў, якія не скарыліся ворагу і заплацілі за гэта сваім маладым жыццём.

Васіль Казак, які дасканала ведае ваенны летапіс свайго горада, стараецца згадаць гісторыю мясцовых патрыётаў пры кожнай сустрэчы са школьнікамі альбо на іншых памятных мерапрыемствах.

— Веліч подзвігу камсамольцаў-падпольшчыкаў у тым, — кажа краязнавец, — што яны былі на гэтай тэрыторыі аднымі з першых, хто ўступіў у барацьбу з ворагам. Яны, маладыя, паказалі прыклад сапраўднай вернасці сваёй краіне. Не на словах, а на справе выказалі сваю адданасць роднай зямлі.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота аўтара і з адкрытых крыніц.**




### • У тыле

На ўлонні вялікага возера раскінуўся калгас «Чырвонае зарава» Лепельскага раёна. «Звязда» пісала, што да вайны ён быў адным з наймацнейшых у раёне. Аднак нямецкія бандыты не абмінулі і гэтай арцелі — яны знішчылі жывёлу і грамадскія будынкі, нанеслі калгасу незлічоныя страты.

Пасля вызвалення ад нямецкіх акупантаў сяляне адразу ўзяліся за яго аднаўленне. «**Нядаўна калгаснікі падрабязна абмеркавалі мерапрыемствы па павышэнню ўраджайнасці, вызначаныя ў пастанове СНК БССР і ЦК КП(б)Б. Уносіліся канкрэтныя прапановы па лепшаму выкарыстанню цяглавай сілы, інвентару, машын і ўгнаенняў**».




У 1945 годзе калгас запланаваў засеяць яравымі культурамі 124 гектары. Падрыхтаваны да палявых работ быў сельскагаспадарчы інвентар. 58-гадовы калгасны каваль Рыгор Кубар адрамантаваў, паводле звестак, 35 барон і 34 плугі. Спрактыкаваныя рымары-самавучкі адрамантавалі 65 хамутоў.

Старанна працавалі і калгасныя конюхі Іван Гоюш і Павел Лобніс. «**Усе 33 калгасныя кані маюць сярэднюю ўкормленасць. Але на адных конях цяжка апрацаваць усю калгасную плошчу. Таму ў сельскагаспадарчай арцелі яшчэ загадзя пачалі рыхтаваць дадатковае цягло — прывучаць да палявых работ малапрадукцыйных кароў. Для кароў зроблена 10 камплектаў вупражы», — паведамляла «Звязда».**

Перадавое месца ў падрыхтоўцы да сяўбы займала трэцяя брыгада на чале з Цімафеем Юшко. Ён быў старанны калгаснік і кіраўнік — яшчэ зімой адрамантаваў 9 аромных і 9 вазавых хамутоў, навіў лейцаў для ўсіх коней брыгады: «**Пяць маіх сыноў змагаюцца на франтах, дабіваюць фашысцкага звера. Я хоць і стары — мне 70 год, але хачу працаваць не горш, чым мае сыны ваююць. Няхай яны ганарацца сваім бацькам брыгадзірам», — гаварыў мужчына.**

Шмат увагі аддавалі сяляне і развіццю жывёлагадоўлі. Загадчык фермы таварыш Буловіч наладзіў добры догляд маладняку і дабіўся абсалютнага захавання ўсіх народжаных цялят і ягнят.

Увогуле калгаснікі «Чырвонага зарава» з уздымам уключыліся ва ўсебеларускае спаборніцтва за найлепшую падрыхтоўку і правядзенне веснавой сяўбы. Тут завяршаліся апошнія перадпасяўныя работы. Хутка людзі выйшлі на сяўбу з добрым насеннем і спраўным інвентаром.

### • На фронце

Паводле звестак Савецкага інфармбюро, на працягу 3 красавіка войскі 2-га Беларускага фронту вялі баі па знішчэнні рэштак акружанай групы нямецкіх войскаў на ўсходзе ад Гданьска і занялі населеныя пункты Ноендорф, Клайнпленедорф, Зігескранц, Хойбудэ, Кракаўеркемпе, Кракау.

Войскі 2-га Украінскага фронту ў гэты дзень сумесна з румынскімі войскамі з баямі занялі горад і чыгуначную станцыю Крэмніца — моцны апорны пункт абароны немцаў на паўднёвых схілах хрыбта Велькафатра, а таксама занялі больш чым 150 іншых населеных пунктаў, сярод якіх буйныя Шпаня Доліна, Кунешоў, Янова Легота, Вялікія Угерцэ, Жабокрэкі, Хіноранy, Яцоўцэ, Бойна, Драгоўцэ, Долны Крупо, Смоленіцэ, Омпітал, Часта, Святы Юр і многія іншыя.

Войскі 3-га Украінскага фронту ў выніку наступлення танкавых злучэнняў і пяхоты авалодалі на тэрыторыі Аўстрыі прамысловым горадам і буйным чыгуначным вузлом Вінер, Нойштат і гарадамі Эйзенштат, Неункірхен, Глогніц — важнымі апорнымі пунктамі абароны немцаў на подступах да Вены, а таксама занялі звыш 100 іншых населеных пунктаў, у тым ліку Огау, Донерскірхен, Хоф, Потэндорф, Эбенуфурт, Блюмау, Эбрэйхсдорф, Мітэрндорф, Фельм, Мюнхендорф, Трайскірхен, Мацэндорф, Фішау, Вейкерсдорф. **Адначасова на захадзе і паўднёвым захадзе ад возера Балатон франтавікі, наступаючы сумесна з войскамі балгарскай арміі, занялі больш чым 80 населеных пунктаў, сярод іх — Себеборцы, Мурска Собота, Баглад, Мікефа, Варфельдэ, Баноксентдзьердзь, Бечэхей, Которыба, Дольні Дубрава. У баях за 2 красавіка войскі фронту ўзялі ў палон больш чым 12 тысяч салдат і афіцэраў праціўніка і захапілі наступныя трафеі: самалётаў — 30, танкаў і самаходных гармат — 71, бронетранспарцёраў — 27, палявых гармат — 124, кулямётаў — 129, аўтамашын — 159, паравозаў — 25, чыгуначных вагонаў — 927, складаў з боепрыпасамі, узбраеннем і прадуктамі харчавання — 38.**

**Вядучая рубрыкі Яна ВАЛАСАЧ.**

НАПЯРЭДАДНІ ПАДЗЕІ

# ПРЫГОЖА, З ГОНАРАМ І ГОДНАСЦЮ

## Карэспандэнты «Звязды» сталі сведкамі падрыхтоўкі ваеннаслужачых да парада 9 Мая



Сёлета цэнтральнай падзеяй Дня Перамогі стане ваенны парад у Мінску. Актыўная падрыхтоўка да яго ідзе ўжо некалькі месяцаў. Аб асаблівасцях парада юбілейнага 2025 года журналістам расказалі на зводнай гарнізоннай трэніроўцы пешых разлікаў, якая адбылася на пляцы Мінскай ваеннай камендатуры.

### Героям мінулага — ад абаронцаў будучыні

По словах арганізатараў, мерапрыемства будзе падзелена на дзве маштабныя часткі — гістарычную і сучасную. У гераічнае мінулае акуне рэтратэхніка і парадныя разлікі ў форме і з узбраеннем ваенных гадоў. Пешыя парадныя разлікі пройдуць перад гледачамі са сцягамі і прымацаванымі да іх ордэнамі, якія былі атрыманы злучэннямі і вайсковымі часцямі ў перыяд вызвалення Беларусі.

Часткова будуць адноўлены элементы першага Парада Перамогі, які прайшоў у Маскве ў чэрвені 1945 года. Адны ўдзельнікі выйдуць у форме воінаў Чырвонай Арміі, іншыя — у форме міліцыі ўзору 1941-га. У руках байцоў у партызанскай экіпіроўцы будзе развявацца Сцяг партызанскага атрада «Радзіма» брыгады «Разгром» — сімвал народнага супраціўлення фашысцкім акупантам. Упершыню гледачы змогуць убачыць шырокую лінейку ўзораў узбраення і тэхнікі ваенных гадоў.

Другая частка пакажа магутнасць і тэхналагічнасць сучасных Узброеных Сіл Беларусі. Плануецца ўдзел 24-х парадных разлікаў рознай тэхнікі. Ад браніраваных машын апошняга пакалення да перадавых сістэм сувязі і комплексаў радыёэлектроннай барацьбы — усе яны штодня выконваюць задачы па абароне суверэнітэту краіны.

### Рэтратэхніка і «трыццацьчацвёркі»

Усяго ў парадзе да Дня Перамогі — сімвале мужнасці, пераемнасці пакаленняў і гатоўнасці абараніць Айчыну — возьмуць удзел больш за чатыры тысячы вайскоўцаў. Адным з самых відовішчных момантаў традыцыйна стане выступленне роты ганаровай варты, дэманстрацыя ёю бездакорнага плац-парада. Акрамя таго, у складзе пешых калон пройдзе асобны стралковы батальён тэрытарыяльных войскаў. Да таго ж парад Мінскага гарнізона аб'яднае не толькі вайскоўцаў Узброеных Сіл: страявым крокам па сталіцы пройдуць прадстаўнікі такіх сілавых структур, як МУС, Дзяржаўны пагранічны камітэт, МНС і Следчы камітэт Рэспублікі Беларусь.

Парадную калону ўзначаляць легендарныя «трыццацьчацвёркі» — танкі Т-34, увасабленне нашай агульнай Перамогі. Будуць прадэманстраваны і найноўшыя ўзоры, што цяпер стаяць на ўзбраенні беларускай арміі. Напрыклад, тактычны ракетны комплекс «Іскандэр-М», здольны трапляць у цэль на адлегласці да 500 км. Не менш уразяць гледачоў мерапрыемства ракетная сістэма «Паланэз» з далёкасцю дзеяння да 300 км і зенітны комплекс С-400 «Трыумф» — надзейная абарона ад паветраных пагроз.

У складзе 24 парадных разлікаў механізаванай калоны плануецца ўдзел звыш 240 адзінак колавай і гусенічнай тэхнікі, новыя або пасля глыбокай мадэрнізацыі. Выключэннем стануць рэдкія ўзоры ваеннай тэхнікі часоў Вялікай Айчыннай вайны. Іх на бязвыплатнай аснове прадаставілі прадстаўнікі малога бізнесу. Менавіта дзякуючы ім гледачам будуць даступныя ўнікальныя экспанаты — памяць аб гераічным мінулым нашай краіны.

### Хвастаты полк

Адметнай рысай парада стане ўдзел у ім сабак — падапечных Кіналагічнага цэнтра Узброеных Сіл. Унёсак гэтых жывёл у вызваленне Беларусі цяжка пераацаніць. У гады вайны яны дапамагалі сапёрам размініраваць гарады і вёскі, выцягвалі параненых з поля бою і нават падрывалі варожую тэхніку. Таму і было прынята рашэнне аддаць даніну памяці і павагі верным чатырохногім памочнікам.

— Да ўдзелу ў парадзе дапушчаны толькі найлепшыя з найлепшых, — адзначыў **намеснік міністра абароны Аляксандр НАВУМЕНКА**. — Сабакі і іх кінолагі праходзяць інтэнсіўную падрыхтоўку: адпрацоўваюць вытрымку, дакладнасць рухаў, уменне пакідаць убаку шум натоўпу.

Колькі ж часу спатрэбіцца, каб падрыхтаваць службовых сабак да выступлення на такім адказным мерапрыемстве? Пра гэта журналістам расказаў **старшы інструктар Кіналагічнага цэнтра Узброеных Сіл Арцём ФЯДЗЕНЯ**:

— Тэрміны трэніровак індывідуальныя, бо кожны сабака валодае сваім характарам, пачуццямі і эмоцыямі. Акрамя таго, жывёле трэба прывыкнуць да вялікай колькасці людзей і гукаў. Мне пашанцавала: мой напарнік ад прыроды спакойны. Галоўны сакрэт узаемаразумення з сабакам і яго паслухмянства — пастаянныя зносіны і сумесныя трэніроўкі.

### Спадкаемцы баявой славы

«Сёння ў страі стаяць ужо ўнукі і праўнукі тых, хто 80 гадоў таму прынёс мір на нашу зямлю, — сказаў Аляксандр Навуменка. — І немагчыма не заўважыць, з якімі гонарам і пачуццём адказнасці моладзь адносіцца да падрыхтоўкі да дадзенага мерапрыемства».



Трапятліва захоўвае ў сэрцы подзвіг сваіх дзядоў і прадзедаў і **Віталь ГОРЛАЧ, чацвёртакурснік агульнавайсковага факультэта Ваеннай акадэміі**:

— Парад — гэта даніна памяці продкам і выказванне гонару за іх. Многія мае сваякі ўдзельнічалі ў Вялікай Айчыннай вайне, таму для мяне асабліва важна быць тут і стаяць у першай шарэнзе ў франтавой форме. Я ўжо ўдзельнічаў у парадзе ў мінулым годзе. Тады і нагу высока падняць было няпроста, і раўненне трымаць цяжэй. Але побач заўсёды ёсць таварышы, якія падтрымаюць і падкажуць. Ды і з часам прывыкаем адзін да аднаго: запамінаем манеру хады, рухі, сінхранізуемся. І тады ўсё атрымліваецца — прыгожа, з гонарам і годнасцю.

А вось для **трэцякурсніка Мінскага суворaўскага ваеннага вучылішча Цімура ГОЛДЫ** гэта першы вопыт удзелу ў парадзе. Хлопец даўно аб гэтым марыў і доўга рыхтаваўся.

«Для мяне важна паказаць, што іх подзвіг не забыты, а мы вартыя іх памяці, — падзяліўся Цімур. — Вядома, быць удзельнікам парада няпроста. Але страявую падрыхтоўку ў нас вядуць ужо тры гады — паралельна з базавай падрыхтоўкай».

Упрыгажэннем парада стануць жаночыя разлікі. Сваімі ўражаннямі ад удзелу ў ім падзялілася **Ліяна АЛІСЕЙКА, трэцякурсніца Ваеннай акадэміі**:

— Для мяне гэта ўжо другі парад. Нягледзячы на гэта, вядома, лёгкае хваляванне прысутнічае: усё ж такі вельмі значная дата, адказная і важная падзея. Тым не менш, усё даецца крыху прасцей. А яшчэ перапаўняе гонар за сябе, за сваю краіну. У дзяцінстве мы з бацькамі кожны год садзіліся каля тэлевізара і з самай раніцы глядзелі парад. А цяпер я сама іду ў страі, і гэта зусім невымоўныя адчуванні. А бацькі будуць сярод гледачоў на трыбуне.

### За мір і спакой — разам

Да святкавання 80-й гадавіны Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне далучацца дружалюбныя нам дзяржавы: адны накіруюць парадныя разлікі, іншыя абмяжуюцца сцягавымі групамі.



Свой удзел пацвердзілі ўжо прадстаўнікі Узброеных Сіл Расійскай Федэрацыі і Кітайскай Народнай Рэспублікі. Па словах Аляксандра Навуменкі, перагаворы аб удзеле яшчэ працягваюцца.

— Гэта свята гонару за мужнасць, самаахвярнасць і гераізм нашых продкаў, якія прынеслі свабоду і незалежнасць не толькі нашай дзяржаве, але і ўсёй Еўропе, вызваліўшы яе ад нямецка-фашысцкіх акупантаў, — акцэнтаваў увагу Аляксандр Навуменка. — Гэта дзень гістарычнай памяці, урок кожнаму з нас і для наступных пакаленняў, каб ніхто не забываў гісторыю сваёй дзяржавы.

**Аміна НАЗАРАВА.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**



Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ
В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Бобруйский машиностроительный завод», Могилевская область, г. Бобруйск, ул. К. Маркса, д. 235, УНП 700067266 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 (www.ipmtorgi.by) |

**Предмет электронных торгов – б/у оборудование.**
Местонахождение –
ул. К. Маркса, д. 235, г. Бобруйск, Могилевская область

| Лот, № | Наименование, модель | Инвентарный номер | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Водоохлаждаемый свод к электродуговой печи ДСП-3 | 41001 | 55 513,00 |
| 2 | Водоохлаждаемый свод печи ДСП-1.5 | 40998 | 12 500,00 |
| 3 | Камера КСО-210-БЭСК-КВВ-108-1000-УЗ | 53164 | 16 362,00 |
| 4 | Камера КСО-210-БЭСК-КВВ-108-1000-УЗ | 53165 | 16 362,00 |
| 5 | Камеры КСО (к ДППТУ-6) | 53997 | 41 250,00 |
| 6 | Печь ДППТУ-6 | 40980 | 468 676,00 |
| 7 | Печь дуговая сталеплавильная ДСП-1,5-ИЗ | 40990 | 34 700,00 |
| 8 | Печь электродуговая плавильная ДСП-3-ИЗ | 40991 | 113 000,00 |
| 9 | Пультовая (к ДППТУ-6) | 58214 | 82 974,00 |
| 10 | Реакторы сглаживающие (к ДППТУ-6) | 54003 | 153 490,00 |
| 11 | Система вентиляции и кондиционирования (к ДППТУ-6) | 42027 | 75 361,00 |
| 12 | Система вытяжки газов (к ДППТУ-6) | 42134 | 11 000,00 |
| 13 | Система оборотного водоснабжения (к ДППТУ-6) | 21810 | 372 271,00 |
| 14 | Теплообменник (к ДППТУ-6) | 40986 | 25 068,00 |
| 15 | Тиристорный преобразователь (к ДППТУ-6) | 53999 | 123 266,00 |
| 16 | Трансформатор (к ДППТУ-6), тип ТРЦП-5000/10 ПУХЛУ | 54004 | 366 348,00 |
| 17 | Емкость хранения и подачи крепителя (ХТС), модель П1892М | 40931 | 3 300,00 |
| 18 | Емкость хранения и подачи смолы (ХТС), модель П1902 | 40930 | 4 000,00 |
| 19 | Маслостанция (к ДППТУ-6) | 40983 | 13 800,00 |
| 20 | Машина прессово-встряхивающая формовочная FOROMAT 40-1 с ЧПУ, заводской номер 001/1.041/2012 | 41809 | 198 000,00 |
| 21 | Машина прессово-встряхивающая формовочная FOROMAT 40-1 с ЧПУ, заводской номер 002/1.041/2012 | 41088 | 198 000,00 |
| 22 | Машина формовочная «Форомат-40-1» | 41068 | 18 146,00 |
| 23 | Машина формовочная «Форомат-40» | 41081 | 18 139,00 |
| 24 | Машина формовочная, модель 233М | 41066 | 15 600,00 |
| 25 | Машина формовочная, модель 233М | 41071 | 15 600,00 |
| 26 | Машина формовочная, модель 22506 | 41061 | 41 200,00 |
| 27 | Машина формовочная однопозиционная встряхивающая, модель 22506 | 41063 | 41 200,00 |
| 28 | Стержневая линия для производства мелких стержней, модель П1903 | 40966 | 117 594,00 |
| 29 | Смесеприготовительный комплекс приготовления сырой песчано-глинистой формовочной смеси | 40956 | 129 806,00 |
| 30 | Смесеприготовительный комплекс приготовления сырой песчано-глинистой формовочной смеси, модель 4848А | 40955 | 140 388,00 |
| 31 | Стержневая линия для производства крупных стержней, модель 7259 | 40965 | 126 016,00 |
| 32 | Монорельсовая подвесная дробеметная установка марки Rösler тип (модель) RHBE 27/32-F, серийный (заводской) номер 56994 | 40977 | 453 000,00 |
| 33 | Фильтрующая установка марки Rösler тип (модель) RF 150/18-2 P/w, серийный (заводской) номер 56996 | 40978 | 85 000,00 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение **4–10 %** от цены продажи в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

**Дата и время начала и окончания электронных торгов:**
**с 11.00 до 12.00 05.05.2025.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 02.05.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35, auction@cpo.by**

# АД БАСЕЙНА — ДА ВАРКАЎТ-ПЛЯЦОЎКІ

## Белаазёрск распачаў падрыхтоўку да абласнога фестывалю працаўнікоў вёскі — 2025

На «Дажынках» у Мікашэвічах 5 кастрычніка мінулага года была аб'яўлена сёлетняя сталіца свята хлебаробаў Брэстчыны — Белаазёрск. Горад энергетыкаў, які ўзнік у сувязі з будаўніцтвам Бярозаўскай ГРЭС, у 2025-м рыхтуецца адзначыць сваё 65-годдзе. А значыць, ёсць двайная нагода абнавіць, упрыгожыць горад, стварыць новыя, патрэбныя людзям аб'екты і лакацыі.



Як расказаў карэспандэнту газеты **старшыня Белаазёрскага гарвыканкама Уладзімір ПІЛІПЕЦ**, работы па добраўпарадкаванні горада пачаліся ў канцы зімы і вядуцца ў адпаведнасці з планам. Днямі горад наведаў **старшыня Брэсцкага аблвыканкама Пётр ПАРХОМЧЫК**, які азнаёміўся з ходам работ, правёў нараду з кіраўнікамі службаў і ведамстваў.



Адным з першых аб'ектаў, куды накіравалася рабочая група з вобласці, быў корпус з басейнам аздараўленчага цэнтра «Энергія» РУП «Брэстэнерга». Названы цэнтр працуе даўно, ён узводзіўся як установа для аздараўлення працаўнікоў электрастанцыі. І новы корпус, дзе будзе размешчаны сучасны басейн з усёй патрэбнай інфраструктурай, будуецца за кошт сродкаў Мінэнерга. Але басейн узводзіцца з прыцэлам на ўвесь горад з насельніцтвам 10 800 чалавек. Як растлумачыў Уладзімір Піліпец, плаваннем змогуць займацца вучні ўсіх трох школ, а таксама кожны ахвотны жыхар атрымае магчымасць правесці вольны час з карысцю для здароўя.

Будаўнікі паведамілі губернатару, што басейн прыме сваіх першых наведвальнікаў ужо ў ліпені, а ўрачыстае адкрыццё яго плануюць прымеркаваць да Дня Незалежнасці краіны. **Начальнік генпадраднай арганізацыі Бярозаўскай ПМК–3 Юрый ПУНЬКО** адзначыў: будаўніцтва ідзе ў строгай адпаведнасці з графікам, на пляцоўцы працуе дастатковая колькасць людзей.

Паводле слоў мэра Белаазёрска, асаблівая ўвага ўдзяляецца абнаўленню Дома культуры. Будынак культурнай установы фактычна перажывае капітальны рамонт. Тут будуць абноўлены і фасад, і інтэр'ер. Паводле слоў Уладзіміра Піліпца, кіраўнік вобласці даручыў правесці ў Доме культуры кардынальныя змены, зрабіць яго максімальна камфортным і сучасным.

Пабывала рабочая група і ў гарадской бальніцы, дзе адрамантуюць фасады паліклінікі, хірургічнага і адміністрацыйнага карпусоў, а таксама харчовага блока, будуць праведзены замена дзвярэй, акон, рамонт лесвічных клетак, кабінетаў, калідораў, добраўпарадкаванне тэрыторыі.

Цяпер поўным ходам ідуць работы ў сярэдняй школе № 3 і дзіцяча-юнацкай спартыўнай школе. Запланавана добраўпарадкаванне 22 дваравых тэрыторый, асфальтаванне шэрагу вуліц, пракладка інжынерных камунікацый у новы мікрараён жылой забудовы. «Асаблівая ўвага — зонам адпачынку, — расказаў Уладзімір Піліпец. — Дарэчы, пустка насупраць басейна прыцягнула ўвагу Пятра Пархомчыка. Кіраўнік вобласці заўважыў, што тут так і просіцца невялікая зона адпачынку. Мы з калегамі параіліся і прыйшлі да высновы: на гэтым месцы можна ўладкаваць сквер альбо нават невялікі парк і назваць яго імем Героя Савецкага Саюза Іосіфа Свідзінскага. У нас ёсць вуліца, названая ў гонар былога франтавога разведчыка, а назвай парка мы яшчэ раз аддадзім даніну пашаны герою вайны».

Яшчэ адна зона для адпачынку арганізаваная ў раёне мясцовага возера, працягвае аповед Уладзімір Піліпец. Гэта ўлюбёная гараджанамі мясціна ўпрыгожыцца новымі элементамі інфраструктуры, тут з'явяцца новыя лаўкі, дарожкі, варкаўт-пляцоўка — адным словам, усё для таго, каб сям'ёй можна было камфортна адпачываць каля вады. Тым больш што возера размешчана ў рысе горада.

На нарадзе, якая адбылася пасля наведвання аб'ектаў кіраўніцтвам аблвыканкама, прадставілі план мерапрыемстваў па пераўтварэнні Белаазёрска. Змены пачынаюцца з уезду ў горад. Запланаваны рамонт вуліцы Шасэйнай, асфальтаванне названай вуліцы, аднаўленне тратуараў, уладкаванне дадатковых прыпыначных пунктаў. Перажывуць абнаўленне праспект Міру і вуліца Леніна, цэнтральная плошча горада. Маштабная рэканструкцыя адбудзецца ў гарадскім парку, з'явяцца дадатковыя паркоўкі. Новы выгляд набудуць гандлёвыя аб'екты: крамы «Універсам», «Надзея», «Дом гандлю», рэстаран, будынкі гарадскіх устаноў і арганізацый. Неўзабаве пачнецца бягучы рамонт дзясяткаў жылых дамоў.

«У справу падрыхтоўкі да «Дажынак» уключыліся прадпрыемствы і арганізацыі горада, а таксама яго жыхары. Спадзяюся, што горад пасапраўднаму расцвіце і прыме гасцей фестывалю-кірмашу, працаўнікоў вёскі ў новым сучасным аблічч. І ўсё зробленае будзе служыць людзям доўгія гады», — сказаў старшыня Белаазёрскага гарвыканкама.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота BEREZA.BY**



# «ГЭТА ХТО ТАКОЕ ЯШЧЭ ТВОРЫЦЬ У СВЕЦЕ?»

## Як Літва скрала беларускія пажарныя машыны і малакавозы, а цяпер хоча на гэтым яшчэ і падзарабіць

Факт аднаго крадзяжу, які адбыўся на міждзяржаўным узроўні, мабыць, заслугоўвае таго, каб увайсці ў аналы гісторыі. У сакавіку мінулага года літоўскія ўлады канфіскавалі ў Клайпедскім порце 17 беларускіх пажарных машын і столькі ж малакавозаў, адрасатамі якіх у першым выпадку былі атрымальнікі ў Зімбабвэ, у другім — Кубы.



Пажарныя машыны, перададзеныя Зімбабвэ ў жніўні 2023 г.

Фота Herald Zimbabwe.

Тады нашы прыбалтыйскія суседзі заявілі: маўляў, мы дзейнічаем правільна, у рэчышчы санкцыйнай палітыкі, выконваючы рэстрыкцыі ў дачыненні да Беларусі і кампаніі, якая пастаўляла гэту тэхніку.

Пасля генеральны пракурор Літвы Ніда Грунскенэ паведаміла аб пастанове пракурора, што 17 транспартных сродкаў, якія накіроўваліся ў Зімбабвэ, павінны быць канфіскаваны. Яна таксама растлумачыла, што разглядаецца пытанне аб іх магчымай пастаўцы ва Украіну, і дадала аб інфармаванні ўлад Зімбабвэ аб рашэнні па дыпламатычных каналах. «Мы чакаем, ці скарыстаюцца яны сваім правам на апеляцыю», — дадала Грунскенэ.

**У Зімбабвэ ў сваю чаргу заявілі, што арышт пажарных машын не мае ніякіх прававых падстаў, і нават накіравалі з адпаведнай місіяй у Літву на перагаворы з калегам генеральнага пракурора Зімбабвэ Вірджынію Мабхізу, якую тая выканала ў пачатку 2024 года. Аднак на ўсе прынятыя намаганні літоўскае «правасуддзе» прадэманстравала сваю непахіснасць — зімбабвійскай чыноўніцы адмовілі ў просьбе вярнуць набытую пажарную тэхніку.**

— Нам далі тлумачэнне, што пажарныя машыны ці некаторыя іх кампанеты былі выраблены беларускай кампаніяй, якая знаходзіцца пад санкцыямі ЕС. Зімбабвэ сцвярджае, што мы з'яўляемся невінаватым трэцім бокам, які купіў пажарныя машыны, — расказала выданню ZimLive Вірджынія Мабхіза.

Не падзейнічала і заява прадстаўніка ўрада Зімбабвэ Ндаванінгі Мангвана, які аргументаваў тым, што канфіскаваная (а правільней будзе сказаць украдзеная) пажарная тэхніка тэрмінова неабходная для (цытата) *«аперацый па тушэнні пажараў, абароны жыцця і маёмасці, а таксама захавання аб'ектаў Сусветнай спадчыны Зімбабвэ і найважнейшых сельскагаспадарчых культур, якія выстаялі падчас разбуральнай засухі»*.

Але хіба захаванне аб'ектаў Сусветнай спадчыны і абарона жыцця ды здароўя зімбабвійскіх «абарыгенаў» турбуе літоўскія ўлады?! Ды кіньце дурное! Калі ёсць магчымасць нажыцца на чужым дабры...

Днямі тая ж генпракурор краіны-зладзюгі заявіла: Літва прадасць з аўкцыёну канфіскаваныя малакавозы і пажарныя машыны з Беларусі.

«Рашэнне пракурора аб продажы 17 малакавозаў і 17 пажарных машын ужо прынята. Выкананне ўскладзена на мытнае ўпраўленне», — паведаміла генеральны пракурор. Паводле яе слоў, 17 малакавозаў збіраліся прадаць на аўкцыёне ў аўторак, 1 красавіка. «Мы вельмі спадзяёмся, што хтосьці зможа купіць гэтыя аўтамабілі і перадаць іх Украіне. Думаю, што яны сапраўды патрэбныя Украіне», — заявіла літоўскім СМІ Ніда Грунскенэ.

**Як вам ход? Укралі, а потым яшчэ вырашылі перапрадаць нарабаванае, каб падзарабіць. Не пакінулі сабе, паколькі не вельмі зручна карыстацца машынамі з правабаковым рулявым кіраваннем: Зімбабвэ ж доўгі час знаходзілася пад каланіяльнай залежнасцю брытанскай кароны.**

А тут яшчэ такі піяр можна дадаць, заадно і «пункты» зарабіць у вачах партнёраў па Еўрасаюзе, маўляў, купляеце вы на аўкцыёне для патрэб Украіны, аказваючы тым самым дабрачынnасць у дачыненні да Нэнькі. Прыгожа? Амаль, калі б заробленыя на аўкцыёне грошы пайшлі да таго ж адрасата, аднак не — самім спатрэбяцца.

Самае пацешнае, што інфармацыі аб выніках праведзенага ў аўторак аўкцыёну — нуль, ад слова зусім. Ёсць такое адчуванне, што гэта невыпадкова. З вялікай доляй верагоднасці можна сцвярджаць, што аўкцыён не адбыўся і ахвотных паўдзельнічаць у такой абсурднай (ды і што ўжо граху таіць — злачыннай) схеме не знайшлося, інакш бы літоўцы сёння ва ўсю трубілі аб аглушальным поспеху сваіх хітраспляценняў...

Ну, а што да рэакцыі і прававой ацэнкі гэтых дзеянняў у міжнароднай супольнасці, думаю, яны яшчэ з'явяцца. А вось звычайныя грамадзяне ўжо ва ўсю агучваюць сваё бачанне гэтай сітуацыі ў сеціве. Мы пачыталі, што пішуць карыстальнікі: *«Зладзюгі», «Гэта іх памылка, Літва падпісала сабе прыгавор», «Гэта хто такое яшчэ творыць у свеце?», «Ім за танк патопleны трэба плаціць...», «Жабрацкая Літва вырашыла ўзбагаціцца за кошт Беларусі і Украіны»* і далей у тым жа духу.

Што ж, з гэтымі меркаваннямі звычайных людзей складана не пагадзіцца. Як думаеце?




Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 (www.cpo.by) |
| **Продавец** | ОАО «НКФО «Белинкасгрупп», 220028, г. Минск, ул. Либаво-Роменская, 23. УНП 807000270 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. УНП 191 224 638. (www.ipmtorgi.by) |

**Предмет электронного аукциона: транспортные средства, бывшие в употреблении. Месторасположение: г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 69**

| № лота | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, руб. |
|---|---|---|
| **1** | FORD TRANSIT CONNECT «INDEEC» 294591-01, 2011 г. в., рег. знак АР 9564-7 | 10 706,21 |
| **2** | FORD TRANSIT CONNECT INDEEC 294591-01, 2011 г. в., рег. знак АР 9575-7 | 10 793,69 |
| **3** | FORD TRANSIT CONNECT INDEEC 294591-01, 2011 г. в., рег. знак АР 8108-7 | 10 765,93 |
| **4** | FORD TRANSIT CONNECT INDEEC 294591-01, 2011 г. в., рег. знак АР 8110-7 | 10 767,64 |
| **5** | FORD TRANSIT CONNECT INDEEC 294595, 2011 г. в., рег. знак АР 8122-7 | 10 741,31 |
| **6** | FORD TRANSIT CONNECT INDEEC 294591-02, 2011 г. в., рег. знак АР 8123-7 | 15 415,52 |
| **7** | FORD TRANSIT CONNECT INDEEC 29459, 2011 г. в., рег. знак АР 8131-7 | 13 518,37 |
| **8** | FORD TRANSIT CONNECT INDEEC 294591, 2011 г. в., рег. знак АР 8121-7 | 8 800,16 |
| **9** | FORD TRANSIT CONNECT INDEEC 294591-01, 2011 г. в., рег. знак АР 8109-7 | 10 754,82 |
| **10** | FORD TRANSIT CONNECT VAN INDEEC 294591-01, 2011 г. в., рег. знак АР 8118-7 | 13 499,92 |
| **11** | FORD TRANSIT CONNECT INDEEC 294591-01, 2011 г. в., рег. знак АР 9601-7 | 13 501,39 |
| **12** | FORD TRANSIT CONNECT INDEEC 294591-01, 2011 г. в., рег. знак АР 8094-7 | 13 535,47 |
| **13** | FORD TRANSIT CONNECT INDEEC 294591-01, 2011 г. в., рег. знак АР 8098-7 | 13 524,73 |
| **14** | FORD TRANSIT INDEEC 29459101, 2011 г. в., рег. знак АР 8143-7 | 10 767,54 |
| **15** | FORD TRANSIT CONNECT INDEEC 29459, 2011 г. в., рег. знак АР 8126-7 | 10 703,76 |
| **16** | FORD TRANSIT CONNECT «INDEEC» 294591-01, 2011 г.в., рег. знак АР 9563-7 | 8 899,68 |
| **17** | FORD TRANSIT CONNECT INDEEC 29459, 2011 г. в., рег. знак АР 8142-7 | 15 425,45 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (BYN); БИК BELBBY2X. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки». УНП 191 021 390

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах**

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by).
Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, которое является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы».
Страница лота содержит информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **6–8 %** от цены продажи лотов в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до момента определения победителя торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 13.03.2025

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 15.04.2025 с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 14.04.2025 до 17.00**
на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: **www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35.**
**E-mail: auction@cpo.by**



## Информация о выплате дивидендов по акциям

1. Полное наименование и местонахождения акционерного общества:

**открытое акционерное общество «Стройтрест № 1»**
Республика Беларусь, г. Минск, ул. Платонова, д. 15.

2. Дата принятия решения годового общего собрания акционеров, в соответствии с которым осуществляется выплата дивидендов по акциям: 27.03.2025 года.

3. Дивиденды, начисленные на одну акцию (указывается по простым и привилегированным акциям (типам привилегированных акций): 1,0813239250 руб.

4. Сроки и порядок выплаты дивидендов по акциям:

**дивиденды выплачиваются:**

- на долю собственности г. Минска – путем перечисления на расчетный счет финансового отдела Первомайского района г. Минска не позднее 22 апреля 2025 года;
- акционерам – физическим лицам – почтовыми переводами не позднее 31 мая 2025 года;
- акционерам – юридическим лицам – на расчетный счет организации не позднее 31 мая 2025 года.

УНП 100288960

# ДЗЯЎЧАТЫ, ПОЙДЗЕМ У КАЛЕДЖ!

## ДА ЗАЛАТОЙ СЯРЭДЗІНЫ

**— Аляксандра Мікалаеўна, прывядзіце аргументы, чаму варта ісці ў каледж, а не ва ўніверсітэт?**

— Пачну з таго, што сучасны ўзровень тэхналогій, падачы інфармацыі, наяўнасць розных сетак нейкія яркія адрозненні ў прафесіях паступова сціраюць. Ну, а калі па сутнасці пытання, то вучоба ва ўніверсітэце не падзяляе навучэнцаў па гендарнай прыкмеце так, як у каледжы. У тэхнічных ВНУ пераважная колькасць студэнтаў — усё яшчэ хлопцы, у гуманітарных — дзяўчаты. Справядліва адзначыць, што тэндэнцыя паступова змяняецца і там: на мужчынскай інжынернай спецыяльнасці вучацца дзяўчаты, а ў педагагічным універсітэце — юнакі. У каледжах крыху іншая сітуацыя. Там усё ж такі больш умоўнага падзелу на «жаночыя» і «мужчынскія» прафесіі. Дарэчы, сёння ў каледжах Беларусі на ўзроўні прафесійна-тэхнічнай адукацыі навучаецца каля 70 тысяч чалавек, на ўзроўні сярэдняй спецыяльнай — больш за 116 тысяч.

На ўзроўні ССА большая частка спецыяльнасцяў дзеліцца пароўну паміж дзяўчатамі і хлопцамі. Напрыклад, праграмісты. Ёсць спецыяльнасці, на якія традыцыйна паступаюць толькі дзяўчаты. Напрыклад, гандлёвая дзейнасць, дашкольная адукацыя, пачатковая школьная адукацыя. А ёсць і чыста мужчынскія спецыяльнасці — тыя, што звязаны з машынабудаваннем. Хоць сёння і там ёсць выключэнні. Што датычыцца ўзроўню прафесійна-тэхнічнай адукацыі, спецыяльнасці якой запатрабаваны і выкарыстоўваюцца ў рэальным сектары эканомікі, то там прыкладна 70 % маладых людзей і 30 % дзяўчат, таму што пералік прафесій для дзяўчат у гэтым выпадку традыцыйна меншы, чым на ўзроўні ССА. Калі ўзяць профільную адукацыю, то педагогіка — гэта больш жаночы профіль, адпаведна, і дзяўчат тут больш: дастаткова прыйсці ў педагагічны каледж, каб у гэтым пераканацца. Калі мы наведаем тэхнічны каледж, напрыклад, машынабудаўнічага профілю, то тут — царства юнакоў. А вось у будаўнічай установе адукацыі выконваецца парытэт — пароўну і тых, і іншых.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## БАНКІР, ЭКАНАМІСТ... БУДАЎНІК

**— Якія спецыяльнасці сёння ў прырытэце ў маладых беларусак?**

— Традыцыйна папулярныя медыцынскія, педагагічныя. На ўзроўні ССА яны заўсёды трымалі марку прэстыжных і мелі высокі прахадны бал. Хачу заўважыць: у гэтыя прафесіі, як правіла, прыходзяць дзяці па прызванні, па покліcы сэрца. І гэта зноў-такі дзяўчаты. Таленавітая моладзь паступае ва ўстановы адукацыі сферы мастацтва, дзе баланс прыкладна аднолькавы. У свой час у сферы ССА вельмі папулярнай сярод прадстаўніц прыгожага полу была спецыяльнасць «Прамысловае і грамадзянскае будаўніцтва». Сёння гэтая спецыяльнасць называецца «Будаўніцтва будынкаў і збудаванняў» і па-ранейшаму карыстаецца попытам сярод нашых юных суайчынніц. Як і эканоміка, банкаўская сфера.



## З КЛАСІКІ — У СУЧАСНАСЦЬ

**— Усё гэта прызнаная «класіка». Якія новыя сферы пакараюць ці толькі збіраюцца пакараць нашы юныя суайчынніцы?**

— Апошнім часам у нас з'явіліся дзяўчаты, якія на ўзроўні ПТА асвойваюць такія нехарактэрныя для сябе прафесіі, як апаратар станкоў з праграмным кіраваннем. На ўзроўні ССА яны асвойваюць такую спецыяльнасць, як «Мехатроніка». Так, час бяжыць, тэхналогіі ідуць наперад, на прадпрыемствах укараняецца новае пакаленне абсталявання, практычна ўсе вытворчыя працэсы аўтаматызуюцца. Не трэба пераносіць цяжар, выконваць фізічна цяжкія аперацыі, таму нашы дзяўчаты часцей сталі выбіраць працу, звязаную з механізацыяй, якую за іх выконвае станок. Яны ж у гэты час займаюцца, напрыклад, праграмаваннем. Калі гаворка зайшла аб праграмаванні, то тут паміж слабым і моцным полам усталяваўся парытэт: 50х50 — дзяўчынкі таксама з вялікім задавальненнем займаюцца праграмаваннем, распрацоўкай мабільных дадаткаў, рознымі электроннымі сістэмамі.

**— Што новага ў гэту ўступную кампанію чакае нашу моладзь?**

— Пачнём з узроўню ССА. У 2025 навучальным годзе ў нас упершыню ў Мінскім гарадскім педагагічным каледжы адкрываецца новая спецыяльнасць «Выхаваўчая праца». Хутчэй за ўсё на яе прыйдуць дзяўчаты, аднак і хлопцаў чакаем. Спецыяльнасці «Тэхнічная эксплуатацыя мультымедыйных сістэм» будуць вучыць ва УА «Беларуская дзяржаўная акадэмія сувязі» — тут таксама чакаем і юнакоў, і дзяўчат. Яшчэ адна сучасная спецыяльнасць «Дызайн гукавога асяроддзя» разлічана на цікавасць усіх дзяцей, незалежна ад іх гендарнай прыналежнасці. Спецыяльнасць «Праграмна-тэхнічнае забеспячэнне лічбавых прылад», якой пачнуць вучыць у Мінскім радыётэхнічным каледжы БДУІР, таксама для змешанага кантынгенту.

Асобна хацела б расказаць пра спецыяльнасць, якая ў большай ступені нацэлена на інтарэсы маладых людзей — «Кузаўны рамонт транспартных сродкаў».

**— Аднак яна не новая?**

— Так, згодна. Сутнасць — у яе сучасным падыходзе. Аўтамабіль у нашым жыцці надоўга, дакладней, назаўжды. Навацыі ў аўтамабілебудаванні праходзяць такімі тэмпамі, што мы не паспяваем за імі. Раней з кузавам працавалі, выкарыстоўваючы традыцыйныя інструменты і сродкі, папросту кажучы, малаток і кавадлу. Цяпер тэхналогіі вырабу кузава памяняліся, і ён сёння можа быць зроблены з інавацыйных матэрыялаў. Таму спецыяліст, якога мы будзем рыхтаваць, павінен быць не толькі высакакласным прафесіяналам у сваёй непасрэднай працы, але і павінен мець і фундаментальную тэарэтычную падрыхтоўку і ведаць усё пра матэрыялы, з якіх выраблены кузаў таго ці іншага аўтамабіля, ведаць усё пра аўтамабілі, самае галоўнае, каб ён быў гатовы развівацца і пастаянна абнаўляць гэтыя веды.

## ЧЫМ ВЫШЭЙШЫ БАЛ, ТЫМ БОЛЬШ МАГЧЫМАСЦЯЎ

**— Засталося высветліць, які конкурс чакаецца на запатрабаваныя як эканомікай, так і абітурыентамі, спецыяльнасці і што трэба, каб усё атрымалася?**

— Калі браць у разлік леташнія віны, то на спецыяльнасці, звязаныя з мультымедыйнымі сістэмамі, лічбавымі прыладамі і праграмаваннем, чаканы прахадны бал можа вар'іравацца ад 8 да 10 балаў. Да 9 балаў — на спецыяльнасці медыцынскага і педагагічнага профілю.

Нагадаю, што ў адрозненне ад ВНУ, дзе недахопы ў атэстаце можна кампенсаваць вынікамі тэсціравання, у сістэме ССА і ПТА такой магчымасці няма. Тут вагу мае толькі атэстат. І па-ранейшаму выйграе той, хто добра вучыўся ў школе, у каго добрыя адзнакі ў дакуменце аб адукацыі. Чым вышэйшы бал — тым больш магчымасцяў, чым ніжэйшы — тым меншы выбар. Да гэтага трэба ставіцца вельмі сур'ёзна, таму што на некаторыя спецыяльнасці ў нас назіралася канкурэнцыя нават сярод дзяцей з высокім балам.

**— Як усё ж такі маладому чалавеку дапамагчы зразумець, што ён выбірае тую самую, сваю спецыяльнасць?**

— Існуе мноства магчымасцяў. Напрыклад, дні адчыненых дзвярэй у каледжах. Не толькі яркія, але і вельмі карысныя ўражанні дае дзецям наведванне Рэспубліканскага конкурсу прафесійнага майстэрства сярод навучэнцаў каледжаў, які сёмы раз пройдзе ў маі гэтага года. Відовішча незабыўнае, запрашаем!

**Алена ВІНАГРАДАВА.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**


## Извещение о проведении **17 апреля 2025 года** повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

| Предмет торгов | |
|---|---|
| Капитальное строение с инв. номером 630/С-47149 общей площадью 647,0 кв. м (наименование – административное здание; назначение – здание административно-хозяйственное; составные части и принадлежности: бетонный подвал); капитальное строение с инв. номером 630/С-47154 общей площадью 397,2 кв. м (наименование – склад материальный; назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ); капитальное строение с инв. номером 630/С-47152 общей площадью 222,7 кв. м (наименование – склад для горюче-смазочных материалов; назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ); капитальное строение с инв. номером 630/С-47155 общей площадью 743,1 кв. м (наименование – боксы для автомашин с пристройкой подсобных помещений; назначение – здание специализированное иного назначения); капитальное строение с инв. номером 630/С-47160 общей площадью 1960,9 кв. м (наименование – ремонтные мастерские; назначение – здание специализированное иного назначения); капитальное строение с инв. номером 630/С-47158 общей площадью 1360,7 кв. м (наименование – пристройка к ремастерским; назначение – здание специализированное иного назначения); капитальное строение с инв. номером 630/С-47156 общей площадью 1123,1 кв. м (наименование – боксы для автомашин; назначение – здание специализированное иного назначения); капитальное строение с инв. номером 630/С-55558 общей площадью 35,0 кв. м (наименование – навес под баллоны; назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ); капитальное строение с инв. номером 630/С-55622 (наименование – ограждение; назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ; составные части и принадлежности: а1 – ограждение из силикатного кирпича (1,95 м х 2,34 м х 0,25 м), площадью 4,6 кв. м); капитальное строение с инв. номером 630/С-55620 (наименование – ограждение; назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ; составные части и принадлежности: а1 – ограждение из металлической арматуры (21,0 м х 2,69 м), площадью 56,5 кв. м, на металлических столбах (0,1 м х 2,60 м)); капитальное строение с инв. номером 630/С-55611 (наименование – ограждение; назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ; составные части и принадлежности: а1.1. – ограждение из силикатного кирпича (13,94 м х 2,85 м х 0,25 м), 39,7 кв. м, а1.2. – ворота металлические (4,07 м х 2,85 м)); капитальное строение с инв. номером 630/С-55610 (наименование – ограждение; назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ; составные части и принадлежности: а1 – ограждение бетонное (97,5 м х 1,71 м), 166,7 кв. м с 31 кирпичным столбиком с бетонными оголовками; а.1.1. – металлическая решетка (1,50 м х 1,97 м), 41,37 кв. м; а2 – ворота металлические (5,96 м х 3,70 м), 22,1 кв. м; а2.1. – калитка металлическая (1,62 м х 2,30 м), 3,73 кв. м); капитальное строение с инв. номером 630/С-55608 общей площадью 7260,0 кв. м (наименование – площадка; назначение – сооружение неустановленного назначения; составные части и принадлежности: а1 – площадка из асфальтобетона); капитальное строение с инв. номером 630/С-55607 общей площадью 465,0 кв. м (наименование – площадка; назначение – сооружение неустановленного назначения; составные части и принадлежности: а1 – площадка из бетонной плитки); оборудование котельной с инв. номером 146 (котел КВЖ-02, 2 шт.; циркуляционный насос, 4 шт.; бойлер 10 куб. м, 1 шт.; топливопровод 20 м; щит управления) | |
| Сведения о земельном участке: площадь – 1,331 га, кадастровый номер – 642000000002000230 | |
| Местонахождение: Минская область, Молодеченский район, г. Молодечно, ул. Замковая, 33 | |
| Начальная цена: 1 363 662,00 бел. руб. без учета НДС | |
| Сумма задатка: 136 000,00 бел. руб. | Обременение: аренда |

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

**Условие торгов:** Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, кодификатор назначения платежа – 40901, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник не согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся **17 апреля 2025 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 04.04.2025 по 16.04.2025** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**По вопросу осмотра продаваемого имущества следует обращаться по телефонам: (017) 388-43-21; (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).**
**Телефоны для справок: (017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 388-43-21; (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).**

# ВЫБРАЦЬ ЖЫЦЦЁ

## У складанай сітуацыі важна дзейнічаць правільна

Дзіця, якое яшчэ не народжана, мае права на жыццё — гэта маральная запаведзь не раз гучала падчас мерапрыемства, якое правялі Грамадскае аб'яднанне «Беларускі саюз жанчын» сумесна з Беларускай праваслаўнай царквой 31 сакавіка на базе Мінскай духоўнай акадэміі імя святога Кірылы Тураўскага.





На сустрэчы з маладзёжным актывам БСЖ быў паказаны мастацка-дакументальны фільм «Маміна пісьмо», зняты ў 2024 годзе праваслаўным тэлеканалам «Спас» (РФ) і прысвечаны абароне дзяцей да нараджэння.

— Вельмі важна задумвацца пра сэнс жыцця, пра тое, якія я здзяйсняю ўчынкі і да чаго яны прыводзяць, таму што часта памылкі людзей заснаваны на матэрыяльным, а не на духоўным поглядзе на жыццё, — звярнуўся **старшыня Сінадальнага аддзела Беларускай праваслаўнай царквы па культуры і царкоўным мастацтве протаіерэй Іаан ЗАДАРОЖЫН** да ўдзельнікаў мерапрыемства. Протаіерэй перадаў Беларускаму саюзу жанчын зварот Мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага Веніяміна, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі.

Большасць жанчын у тым ці іншым узросце, статусе і становішчы аказваюцца перад выбарам: захаваць жыццё дзіцяці або забіць яго. Прымаючы такое рашэнне, важна не паддацца ўплыву абставін, чужога негатыўнага вопыту і захаваць жыццё яшчэ не народжанага малога, падкрэсліла **намеснік старшыні БСЖ, намеснік дырэктара па медыцынскай экспертызе і рэабілітацыі РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава Іна САЛДАЦЕНКА.**

— Будзьце заўсёды стойкія ў прыняцці свайго рашэння, — звярнулася яна да ўдзельніц сустрэчы. — Думайце пра тое, якой вы хочаце быць праз дваццаць гадоў, глядзіце ў будучыню.

У цэнтры мастацка-дакументальнага фільма «Маміна пісьмо» — жыццёвыя гісторыі дзвюх жанчын, маці і яе дарослай дачкі. Кожная з іх сутыкнулася з незапланаванай цяжарнасцю, і перад кожнай стаіць праблема выбару — захаваць жыццё дзіцяці або пазбавіцца ад яго. Стваральнікі фільма паказалі гісторыі шматлікіх жанчын, якія апынуліся ў падобнай сітуацыі, а таксама каментарыі дактароў-гінеколагаў, псіхолагаў, святароў аб праблеме абортаў, іх сацыяльных прычынах і наступствах для жанчыны.

Падчас прагляду многія ў зале выціралі слёзы. Калі экран пагас, стала відавочна: гісторыі гераінь знайшлі водгук у сэрцах гледачоў. Можна з упэўненасцю сказаць: абыякавых у зале не было.

Паказ фільма «Маміна пісьмо», які дапамагае юнакам і дзяўчатам усвядоміць, што жыццё — неацэннае, а самае дарагое для чалавека — сям'я і блізкія людзі, будзе працягнуты на розных пляцоўках.

**Алена ВАЛЕР'ЕВА.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ

**Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП»**
**16 апреля 2025 в 14.00 проводит повторные торги по продаже следующих объектов**

| № п/п | Наименование объекта продажи | Начальная цена продажи составляет с учетом НДС 20 %, белорусских рублей | Задаток, белорусских рублей |
|---|---|---|---|
| Лот № 1 | **Станок токарный (б/у),** инвентарный номер 00444309, заводской номер 17690, 1967 года выпуска | 6 600,00 (шесть тысяч шестьсот рублей 00 копеек) | 660,00 (шестьсот шестьдесят рублей 00 копеек) |
| Лот № 2 | **Токарно-винторезный станок (б/у),** Н, металл, инвентарный номер 00440300, заводской номер 20714, 1976 года выпуска | 4 800,00 (четыре тысячи восемьсот рублей 00 копеек) | 480,00 (четыреста восемьдесят рублей 00 копеек) |

**Собственник имущества:** открытое акционерное общество «Кричевцементношифер», 213493, Республика Беларусь, Могилевская область, Кричевский р-н, Краснобудский с/с, 2, АБК в районе месторождения «Каменка», тел. +375224120909, тел. для осмотра объектов продажи +375224120914.

**Организатор торгов:** унитарное предприятие по оказанию услуг «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты», г. Могилев, ул. Циолковского, 1.

**Место проведения торгов:** г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112, унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Лоты №№ 1, 2 продаются без условий на торгах в форме открытого аукциона с применением метода повышения начальной цены, с шагом 5 (пять) процентов от предыдущей названной аукционистом цены.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору торгов в сроки, указанные в извещении, следующие документы: заявление на участие в торгах; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения торгов; соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения торгов (в двух экземплярах); копию платежного поручения о внесении задатка, заверенную банком.

Задаток перечисляется на расчетный счет унитарного предприятия «Могилевское отделение БелТПП»: № BY88ALFA30122641790010270000 в ЗАО «Альфа-Банк», г. Могилев, BIC: ALFABY2X, УНП 700016628; физическим лицам – предъявить паспорт, иные документы в соответствии с Положением о порядке организации и проведения торгов по продаже объектов, находящихся в собственности юридических лиц и индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь, организуемых унитарным предприятием «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты».

**Условия регистрации, участия в торгах размещены на интернет-сайте организатора по адресу: www.mogilev.cci.by**

**Срок заключения договора купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем)** – в течение 10 календарных дней после проведения торгов.

Срок оплаты предметов торгов на условиях заключенного договора купли-продажи.

Торги состоятся **16 апреля 2025 г. в 10.00** по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112, Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Срок подачи заявления: с момента выхода публикации настоящего извещения в рабочие дни с 09.00 до 12.00 и с 14.00 до 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112.

Последний срок подачи заявления – 15 апреля 2025 г. до 12.00.

Регистрация участников торгов 16 апреля 2025 г. с 09.30 до 10.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, к. 112, унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Телефоны для справок: **(0222) 778032, +375 44 735 00 30** – Жилина Ольга Александровна. *Извещение о предыдущих торгах по объектам было размещено в газете «Звязда» от 22.02.2025*



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ

**Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП»**
**17 апреля 2025 в 14.00 проводит повторные торги по продаже следующих объектов**

| № п/п | Наименование объекта продажи | Основные технические и эксплуатационные характеристики | Начальная цена продажи снижена на 20 % и составляет с учетом НДС 20 %, белорусских рублей | Задаток, белорусских рублей |
|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 | **Капитальное строение с инвентарным номером 712/D-8694** | Назначение – торговое помещение, наименование – хозяйственный магазин. Общая площадь – 1070,4 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская область, Кировский район, Мышковичский с/с, аг. Мышковичи, ул. Дворцовая, д. 25-7 на земельном участке с кадастровым номером 722582201601000570 площадью 0,5232 га | 120 960,00 (сто двадцать тысяч девятьсот шестьдесят рублей 00 копеек) | 12 096,00 (двенадцать тысяч девяносто шесть рублей 00 копеек) |

**Собственник имущества:**

Открытое акционерное общество «Рассвет им. К. П. Орловского», 213944, Республика Беларусь, Могилевская область, Кировский р-н, а. г. Мышковичи, ул. Орловского, 24, тел. +375223770601, тел. для осмотра объектов продажи +375223770615.

**Организатор торгов:** унитарное предприятие по оказанию услуг «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты», г. Могилев, ул. Циолковского, 1.

**Место проведения торгов:** г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112, унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Лот № 1 продается без условий на торгах в форме открытого аукциона с применением метода повышения начальной цены, с шагом 5 (пять) процентов от предыдущей названной аукционистом цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору торгов в сроки, указанные в извещении, следующие документы: заявление на участие в торгах; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения торгов; соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения торгов (в двух экземплярах); копию платежного поручения о внесении задатка, заверенную банком.

Задаток перечисляется на расчетный счет унитарного предприятия «Могилевское отделение БелТПП»: № BY88ALFA30122641790010270000 в ЗАО «Альфа-Банк», г. Могилев, BIC: ALFABY2X, УНП 700016628; физическим лицам – предъявить паспорт, иные документы в соответствии с Положением о порядке организации и проведения торгов по продаже объектов, находящихся в собственности юридических лиц и индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь, организуемых унитарным предприятием «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты».

**Условия регистрации, участия в торгах размещены на интернет-сайте организатора по адресу: www.mogilev.cci.by**

**Срок заключения договора купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем)** – в течение 10 рабочих дней после проведения торгов.

Срок оплаты предметов торгов на условиях заключенного договора купли-продажи.

**Торги состоятся 17 апреля 2025 г. в 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112, унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».**

Срок подачи заявления: с момента выхода публикации настоящего извещения в рабочие дни с 09.00 до 12.00 и с 14.00 до 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112.

**Последний срок подачи заявления – 16 апреля 2025 г. до 12.00.**

Регистрация участников торгов 17 апреля 2025 г. с 13.30 до 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, к. 112, унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Телефоны для справок: **(0222) 778032, +375 44 735 00 30 – Жилина Ольга Александровна.** *Извещение о предыдущих торгах по объектам было размещено в газете «Звязда» от 08.01.2025; 05.03.2025*



**Информация о проведении открытого аукциона 08 мая 2025 г. на право аренды земельного участка**

***Организатор аукциона: Смолевичский районный исполнительный комитет, 222201, г. Смолевичи, ул. Советская, д. 125.***

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь (га) | Целевое назначение | Срок аренды | Начальная цена земельного участка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Минская область, Смолевичский район | 624800000001002568 | 0,9 | Для строительства и обслуживания производственной базы | 99 лет | 12 577,50 |
| 2 | Минская область, Смолевичский район, Заболотский с/с, 112, вблизи д. Миколаевичи | 624882000015000121 | 0,7746 | Для строительства и обслуживания производственно-складских зданий и сооружений | 99 лет | 21 476,79 |
| 3 | Минская область, Смолевичский район, Озерицко-Слободской сельсовет, 33В, вблизи д. Динаровка | 624883000018000400 | 0,6616 | Для строительства и обслуживания административно-складских зданий и сооружений | 99 лет | 28 594,31 |

Аукцион состоится 08 мая 2025 г. в 15.00 в Смолевичском районном исполнительном комитете по адресу: *г. Смолевичи, ул. Советская, д. 125*, зал заседаний.

Извещения о проведении аукциона размещены на сайтах: Государственного комитета по имуществу – https://au.nca.by/, http://rlt.by/ru/, Смолевичского райисполкома – isp@smolevichi.gov.by, на сайте Минского областного исполнительного комитета.

УНП 6000014139

# НЕ ПОЛЕ ПЕРАЙСЦІ

## Старасць для большасці — час выпрабаванняў

МАЙЦЕ НА ЎВАЗЕ

**У дарослых паліклініках Мінска з восені 2023 года дзейнічаюць кабінеты «Школа актыўнага даўгалецця», мэта якіх — адкласці заўчаснае старэнне, навучыць пажылых людзей умелай самадапамозе. Гэтыя школы адкрыты як для саміх пацыентаў пенсіённага ўзросту, так і для сваякоў тых, хто страчвае самастойнасць, становіцца залежным.**



Чаму ў гэты перыяд варта атрымаць кансультацыю герыятра? На што павінны звяртаць увагу блізкія пажылых людзей? Што вядзе да заўчаснага старэння? Высвятляем з загадчыцай Мінскага гарадскога герыятрычнага цэнтра Ірынай ТОКАРАВАЙ.

— У фокусе нашай увагі — грамадзяне ва ўзросце ад 75 гадоў. Для іх распрацаваны спецыяльныя апытальнікі, метадычныя рэкамендацыі па раннім выяўленні сіндрому старэчай астэніі (ССА), герыятрычных сіндромаў, ацэнкі кагнітыўных функцый (шкала MMSE), — тлумачыць Ірына Віктараўна. — Часцей за ўсё пацыенты звяртаюцца да мяне з пытаннямі, якія датычацца карэкцыі медыкаментознага лячэння, рэжыму дня, фізічнай нагрузкі, харчавання, рэабілітацыі, арганізацыі догляду маларухомых састарэлых сваякоў.

***— Галоўная складанасць у барацьбе з узроставымі паталогіямі, мусіць, у тым, што пры «першых трывожных званочках» чалавек не звяртаецца да ўрача, а потым страчвае крытычнасць. У выніку ў поле зроку спецыялістаў ён часта трапляе, калі ўжо ўсё вельмі запушчана...***

— На жаль, так. Нярэдка людзі заўважаюць некаторыя змены да горшага ў сваім стане, але спісваюць гэта на стомленасць, узрост і г. д. Вельмі важна, каб і сваякі былі напагатове, і ўрачы агульнай практыкі пры асабістых кантактах з пацыентамі звярталі ўвагу на змены ў стане здароўя, своечасова накіроўвалі па дапамогу да профільных спецыялістаў. Пагаршэнне зроку, слыху, змена хады ў пажылых — таксама праявы старэчай астэніі.

Умеранае і выяўленае зніжэнне кагнітыўных функцый медыкі заўважаюць у пацыентаў і без правядзення дадатковых апытанняў. Праблема ў тым, што найбольш эфектыўная тэрапія дэменцыі на ранніх стадыях, але якраз «на старце» ўсе яе разнавіднасці (і сасудзістую, і неўдакладненага генезу, і на фоне хваробы Альцгеймера) рэдка атрымліваецца дыягнаставаць.

***— Пра што варта памятаць сваякам пажылых людзей? Якія змены ў паводзінах і стане блізкага чалавека павінны стаць прычынай для візіту да ўрача?***

— Калі пажылыя людзі жывуць асобна, іх трэба максімальна часта наведваць, не пакідаць без увагі. Па тэлефоне не заўсёды можна здагадацца аб рэальным становішчы спраў. Калі пажылы сваяк перастае ўдзяляць увагу асабістай гігіене, становіцца неахайным, забывае есці і прымаць прызначаныя яму прэпараты, пад любымі падставамі адмаўляецца ад прагулак на свежым паветры, пачынае коратка адказваць на пытанні, забываецца пра раней важныя для яго падзеі — усё гэта прычыны для хваляванняў і звароту да медыкаў. Наша сумесная з блізкімі і роднымі задача — як мага даўжэй захаваць аўтаномнасць і самастойнасць старых людзей, іх здольнасць да самаабслугоўвання.



***— Вы гаварылі пра герыятрычныя сіндромы. Растлумачце, што гэта такое. Ці можна іх карэкціраваць?***

— Герыятрычных сіндромаў вельмі шмат. Сярод асноўных — саркапенія (страта мышачнай масы і сілы), зніжэнне кагнітыўных функцый, сіндром падзення, сіндром мальнутрыцыі (гэта значыць, недастатковасць харчавання), парушэнне хады, нетрыманне мачы і іншыя. Для таго каб эфектыўна падкарэкціраваць гэтыя парушэнні, трэба правільна вызначыць іх прычыны. Напрыклад, пажылы пацыент скардзіцца на падзенні. Гэта можа быць наступствам і артэрыяльнай гіпертэнзіі (АГ), і парушэння сардэчнага рытму, і гіпаглікеміі пры цукровым дыябеце, і хваробы Паркінсона і г. д. Упасці можна нават з-за вялікай дозы лекаў пры АГ, калі рэзка зніжаецца ціск. Кожны пацыент патрабуе індывідуальнага падыходу — трэба знайсці аптымальны алгарытм дапамогі.

***— Так, усе людзі розныя. Напэўна ёсць тыя, хто ў 55 лічыць сябе старым, а нехта і ў 80 не спяшаецца спісваць сябе з разліку.***

— Адрозніваюць тры ўзросты: каляндарны (пашпартны, храналагічны), біялагічны, які вызначаецца захаванасцю нашых органаў і сістэм, і псіхалагічны, на які чалавек сам сябе адчувае. Яны не заўсёды супадаюць. Нядаўна ў мяне на прыёме быў 78-гадовы пацыент. Некаторыя праблемы са здароўем у мужчыны меліся, але ён на іх не зважаў. У гутарцы са мной прызнаўся: больш за ўсё яму не падабаецца сустракацца з аднагодкамі — маўляў, яму з імі нецікава, толькі пра хваробы і размаўляюць. Ён жа катаецца на веласіпедзе, рэгулярна плавае, нядаўна завяршыў будаўніцтва ўласнай хаты. На жаль, гэта не самы тыповы прыклад. Мне даводзіцца бачыць дастаткова тых, хто спісвае сябе з разліку раней за 75 гадоў («афіцыйны» ўзрост старэння).

***— Што часцей за ўсё выклікае заўчаснае старэнне?***

— Для многіх гэта выхад на пенсію. Жанчынам ён даецца звычайна прасцей — у іх шмат хатніх абавязкаў; як правіла, ёсць унукі, якія патрабуюць часу і клопату. А вось мужчыны часта аказваюцца ў групе рызыкі. На пенсіі яны адчуваюць сябе непатрэбнымі, упадаюць у дэпрэсію, замыкаюцца ў адзіноце, ізаляцыі. Да заўчаснага старэння таксама вядуць хранічныя захворванні, маларухомы лад жыцця, хібы харчавання, шкодныя звычкі, асаблівасці характару.

***— Многія пажылыя людзі пакутуюць ад цэлага «букета» захворванняў. А гэта патрабуе прыёму розных лекаў, якія аб'ектыўна — таксама фактар рызыкі для здароўя. Ці вырашальная, на ваш погляд, такая праблема?***

— Ёсць вымушаная поліпрагмазія (адначасовы прыём вялікай колькасці лекаў). Напрыклад, пацыент хварэе на цукровы дыябет другога тыпу (гэта вельмі распаўсюджаная паталогія ў пажылым узросце). Хутчэй за ўсё яму прызначаюцца два прэпараты. Іх адмена пагражае слепатой, паражэннем нырак, а часам і ампутацыяй канечнасцяў. Калі ў такога чалавека высокі артэрыяльны ціск, то, каб пазбегнуць ускладненняў, неабходна прымаць яшчэ некалькі медыкаментаў. Пасля перажытых інфарктаў, пры парушэннях сардэчнага рытму (у залежнасці ад асаблівасцяў дыягназаў) прызначаюць 2—4 лякарствы, без якіх не абысціся. Такая рэальнасць. Але, безумоўна, ёсць выпадкі, калі ад шэрагу прэпаратаў і ў сталым узросце можна адмовіцца. Успамінаю мужчыну, у якога ў маладосці была язва дванаццаціперснай кішкі. Чалавек і сёння для прафілактыкі лічыць неабходным раз у квартал абавязкова прымаць як мінімум тры прэпараты, прычым два з іх — антыбіётыкі. Але гэта зусім неапраўдана — бактэрыя хелікабактар-пілары ў яго не выяўляецца, паказанні для такога лячэння адсутнічаюць. Сустракаешся з неабгрунтаваным прыёмам вітамінаў (прычым няспынным), антыдэпрэсантаў і снатворных, седатыўных прэпаратаў. Імкнуся пераканаць пацыентаў, што яны цалкам могуць абысціся без іх, падказваю, як вырашыць праблемы, не звяртаючыся да медыкаментаў.

**Вольга ПАКЛОНСКАЯ,**
**фота аўтара.**


Центр Промышленной Оценки

**• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ • ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390. (www.cpo.by) |
| **Продавец** | ОАО «НКФО «Белинкасгрупп», 220028, г. Минск, ул. Либаво-Роменская, 23. УНП 807000270 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. УНП 191 224 638. (www.ipmtorgi.by) |

**Предмет электронного аукциона: транспортные средства, бывшие в употреблении. Месторасположение: г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 69**

| № лота | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, руб. |
|---|---|---|
| **1** | VOLKSWAGEN CADDY PRACTIK 19277, рег. знак АР 8176-7, 2014 г. в. | 27 716,75 |
| **2** | VOLKSWAGEN CADDY PRACTIK 19277-01, рег. знак АР 8243-7, 2014 г. в. | 27 716,75 |
| **3** | VOLKSWAGEN CADDY PRACTIK 19277, рег. знак АР 8177-7, 2014 г. в. | 27 849,56 |
| **4** | VOLKSWAGEN CADDY RYCAR 29454, рег. знак АС 0156-7, 2010 г. в. | 9 917,68 |
| **5** | VOLKSWAGEN TRANSPORTER, рег. знак АР 8200-7, 2008 г. в. | 11 439,01 |
| **6** | FORD TRANSIT INDEEC 29459-04, рег. знак АС 0218-7, 2012 г. в. | 11 968,94 |
| **7** | FORD TRANSIT VAN INDEEC 29459-04, рег. знак АР 8178-7, 2010 г. в. | 12 491,16 |
| **8** | FORD CONNECT INDEEC 294591-01, рег. знак АР 9557-7, 2011 г. в. | 8 381,30 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (BYN); БИК BELBBY2X. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки». УНП 191 021 390

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах**

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by). Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, которое является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы». Страница лота содержит информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **6–8 %** от цены продажи лотов в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до момента определения победителя торгов без объяснения причин снятия

Извещение о проведении предыдущих электронных торгов опубликовано в «Звязда» 19.03.2025 г.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 15.04.2025 с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки,
в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются**
**по 14.04.2025 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: **www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35. E-mail: auction@cpo.by**



Извещение о проведении **17 апреля 2025 года**
повторных торгов с условиями по продаже имущества,
принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

| **Предмет торгов** |
|---|
| Капитальное строение с инв. № в ЕГРНИ 600/С-122808 общей площадью 24,4 кв. м (наименование: помещение насосной станции мазута; составные части и принадлежности: кирпичное здание помещения насосной станции мазута 3А1/к, с резервуарами под мазут а1) |
| Сведения о земельном участке: площадь – 0,0774 га, кадастровый номер – 623650100001005578 |
| Местонахождение: Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Заводская, 17/3 |
| Начальная цена: 100 000,00 бел. руб. с учетом НДС |
| Сумма задатка: 10 000,00 бел. руб. |

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, кодификатор назначения платежа – 40901, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежного документа о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **17 апреля 2025 года в 11.30** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов). Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 04.04.2025 по 16.04.2025** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**По вопросу осмотра объекта следует обращаться по телефону: (017) 388-43-21.**
**Телефоны для справок: (017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);**
**(017) 388-43-21, (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»)**

# ТАЙНЫ ІМУНІТЭТУ

## ЁСЦЬ ПРАБЛЕМЫ

Імунітэт — гэта ахоўная сістэма арганізма, якая супрацьстаіць чужародным вірусам і бактэрыям, а таксама пазбаўляецца ад старых і пашкоджаных клетак. Менавіта дзякуючы наяўнасці імунітэту арганізм спраўляецца з захворваннем і папраўляецца. Ды і само слова «імунітэт» паходзіць ад лацінскага «immunitas», якое азначае «вызваленне, збавенне».

Імунітэт бывае прыроджаным і набытым. Прыроджаны закладзены ў чалавека з нараджэння, ён дзейнічае на ўсе чужародныя агенты і вызначаецца спадчыннасцю (генамі). А набыты фарміруецца пасля сустрэчы з канкрэтным чужародным агентам. Набыты імунітэт фарміруецца пасля інфекцыйнага захворвання ці пасля правядзення вакцынацыі. Так, напрыклад, дзякуючы выпрацаванаму імунітэту чалавек, перахварэўшы на некаторыя інфекцыйныя захворванні толькі раз у жыцці, становіцца неўспрымальны да іх, нават пры непасрэдным кантакце з хворымі. Да такіх хвароб адносяцца, напрыклад, адзёр і краснуха.

Што ж сведчыць пра аслаблены імунітэт? Такімі прыкметамі з'яўляюцца частыя прастудныя захворванні, хуткая стамляльнасць, раздражняльнасць, герпес на вуснах, працяглае павышэнне тэмпературы, сіндром хранічнай стомленасці, дрымотнасць, парушэнні сну, частыя галаўныя болі.

## ШТО НЕАБХОДНА ДЛЯ ПАДТРЫМАННЯ?

— Па даных Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, усяго 10 % людзей валодаюць імунітэтам, які абараняе іх практычна ад усіх захворванняў. Яшчэ 10 % маюць прыроджаны імунадэфіцыт: яны хварэюць вельмі часта. У астатніх 80 % сіла імуннай сістэмы залежыць ад умоў і ладу жыцця, — адзначае Алена Лойка.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Што ж рабіць, каб дапамагчы імунітэту? Найперш гэта **збалансаванае харчаванне** з дастатковай колькасцю бялкоў, вітамінаў і мікраэлементаў, клятчаткі. Садавіна неабходная нам для здароўя і настрою круглы год, але ўзімку і вясной асаблівую ўвагу варта аддаць ягадам — ад журавін да абляпіхі. Яны ўтрымліваюць вітаміны, мінералы, пекцін, арганічныя кіслоты, клятчатку — інакш кажучы, цэлы комплекс карысных рэчываў. Не варта забываць аб квашанай капусце. Гэты прадукт паляпшае імунітэт, умацоўвае косці і спрыяе нармалізацыі стрававання. Акрамя таго, змяшчае вітаміны А, В і С, а таксама кальцый, клятчатку, магній і жалеза, якія неабходныя нашаму арганізму.

Варта ўжываць і больш прадуктаў, багатых вітамінам D (рыба, якая з'яўляецца таксама крыніцай амега-3 і амега-6, яйкі, малочныя прадукты) і трыптафанам (індычка, курыца, арэхі). Вярнуць бадзёрасць пасля «зімовай спячкі» дапаможа печань траскі.





**Важна наладзіць паўнавартасны сон.** Менавіта падчас начнога сну ідзе найбольш актыўная выпрацоўка новых імунных клетак, таму спаць не менш за 8 гадзін штодня вельмі важна. Лепш класціся і ўставаць у адзін час нават у выхадныя дні, каб наладзіць свой біярытм.

**Рэгулярныя заняткі спортам або рухальная актыўнасць** у адпаведнасці з узростам і станам здароўя проста неабходны. Рух не толькі павышае агульны тонус арганізма і настрой. Падчас фізічнай актыўнасці павялічваецца выпрацоўка інтэрферонаў, лейкацытаў — важных байцоў імуннага фронту. А ў спалучэнні з рэгулярным загартоўваннем гэта выдатная трэніроўка для імуннай сістэмы. Мы не хварэем ад свежага паветра, марожанага ці халоднай тэмпературы. Прычынай захворвання заўсёды з'яўляюцца бактэрыі ці вірусы. Неабходны мінімум для здароўя — 30 хвілін штодзённай актыўнасці ўмеранай інтэнсіўнасці: хуткая хада, праца ў садзе, актыўныя гульні і інш. Недастатковая фізічная актыўнасць — гэта рост рызыкі развіцця дыябету, раку малочнай залозы і тоўстай кішкі, ішэмічнай хваробы сэрца.

Важная і **адмова ад шкодных звычак**. Даказана, што тытунёвы дым наносіць шкоду ўсім органам і тканкам арганізма чалавека, павялічвае частату развіцця сардэчна-сасудзістых ускладненняў, а таксама парушае імунітэт. У тытунёвым дыме ўтрымліваюцца канцэрагены і атрутныя смолы, якія аслабляюць рэакцыі імуннага адказу, правакуюць развіццё алергічных працэсаў і аўтаімунных захворванняў. Празмерны прыём этанолу значна павялічвае рызыку развіцця інфекцыйна-запаленчых захворванняў (асабліва з боку дыхальнай сістэмы), парушае функцыянаванне ахоўных бар'ераў (скуры і слізістых) і разбурае клеткі імуннай сістэмы.

Яшчэ адна важная ўмова — **пазбягаць стрэсаў, падтрымліваць добры настрой**. Беражліва стаўцеся да сваёй псіхікі, як мага менш думайце пра дрэннае, радуйцеся жыццю. Знайдзіце хобі: займіцеся маляваннем, музыкай, рукадзеллем ці іншымі творчымі відамі дзейнасці. Чытайце кнігі, вывучайце новыя мовы ці асвойвайце новыя навыкі. Стварайце камфорт дома.

> «Па даных Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, усяго 10 % людзей валодаюць імунітэтам, які абараняе іх практычна ад усіх захворванняў. Яшчэ 10 % маюць прыроджаны імунадэфіцыт: яны хварэюць вельмі часта. У астатніх 80 % сіла імуннай сістэмы залежыць ад умоў і ладу жыцця».

**Не варта адмаўляцца ад прышчэпак** па Нацыянальным календары для дзяцей і сезоннай вакцынацыі супраць грыпу для дарослых. Многія баяцца «перагрузіць» імунітэт прышчэпкамі. І дарма.

> **«Перагрузка» імунітэту — гэта ўстойлівы міф, які суправаджае вакцынацыю. Кожны дзень, кожную хвіліну наш арганізм падвяргаецца ўздзеянню сотняў антыгенаў, у тым ліку і вірусаў, і бактэрый, і алергенаў. Але ўсе чамусьці баяцца менавіта тых некалькіх дзясяткаў антыгенаў, якія знаходзяцца ў ампуле з вакцынай.**

Можна не хвалявацца — прышчэпка не перагружае імунную сістэму.

Па рэкамендацыі ўрача **прымайце вітаміны і мінералы**, якія дапамогуць умацаваць імунітэт, напрыклад, вітаміны С і D, цынк і селен. Яны могуць быць асабліва карысныя ў зімовы і вясенні перыяды, калі часта пакутуе імунітэт. Прыродныя сродкамі для ўмацавання імунітэту з'яўляюцца эхінацея, жэньшэнь, лакрычнік, элеўтэракок і лімоннік. Рэкамендавана выкарыстоўваць травяныя настоі і адвары.

**Ранняе выяўленне і лячэнне захворванняў**, у тым ліку хранічных інфекцый, пачынаючы з карыесу і заканчваючы сінусітам, танзілітам і піеланефрытам, таксама спрыяе падтрыманню імунітэту.

**Алена КРАВЕЦ.**


**ООО «Деловая оценка»** (организатор аукциона) по поручению **Добрушское РайПО** (продавец) извещает о проведении **6 мая 2025 года** открытого аукциона по продаже имущества **в 12.00** по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

| |
|---|
| **Лот № 1:** капитальное строение с инв. № 311/С-51601 общей площадью 344,0 кв. м, наименование – магазин № 43, назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности – одноэтажное кирпичное здание магазина с надворными постройками: складом, уборной. Капитальное строение с инв. № 311/С-51602, общей площадью 56,0 кв. м, наименование – склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, составные части и принадлежности – одноэтажное кирпичное здание склада |
| Капитальные строения расположены на земельном участке с кадастровым номером 321282808301000125 площадью 0,1576 га по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, Кормянский с/с, д. Хорошевка, ул. Юбилейная, 1А |
| **Начальная цена** продажи без НДС – 44 300,00 бел. руб. **Задаток** – 443,00 бел. руб. |
| **Лот № 2:** капитальное строение с инв. № 311/С-52024 общей площадью 141,9 кв. м, наименование – магазин №14, назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности – одноэтажное кирпичное с кирпичной пристройкой и котельной здание магазина. Капитальное строение с инв. № 311/С-52023, общей площадью 17,1 кв. м, наименование – гараж, назначение – здание специализированное транспорта, составные части и принадлежности – одноэтажное кирпичное здание гаража. Капитальное строение сдано в аренду по договору аренды |
| Капитальные строения расположены на земельном участке с кадастровым номером 321284803901000149 площадью 0,0430 га по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, Ленинский с/с, аг. Красный Партизан, ул. Краснопартизанская, 1 |
| **Начальная цена** продажи без НДС – 21 840,00 бел. руб. **Задаток** – 218,40 бел. руб. |
| **Лот № 3:** капитальное строение с инв. № 311/С-50662 общей площадью 262,7 кв. м, наименование – магазин № 41, назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное с кирпичной пристройкой здание магазина с надворными постройками: навесом, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 321282804101000786 площадью 0,1050 га по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, Кормянский с/с, аг. Корма, ул. Комсомольская, 2. Капитальное строение сдано в аренду по договору аренды |
| Лот включает оборудование в количестве 12 ед. Перечень имущества опубликован на сайте **www.deloocenka.by** |
| **Начальная цена** продажи без НДС – 47 820,00 бел. руб. **Задаток** – 478,20 бел. руб. |
| **Лот № 4:** капитальное строение с инв. № 311/С-52960 общей площадью 226,7 кв. м, наименование – магазин №40, назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности: одноэтажное блочное облицованное кирпичом здание магазина с надворными постройками: сараем, уборной, забором. Капитальное строение с инв. № 311/С-49825, общей площадью 31,0 кв. м, наименование – склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание склада. Капитальное строение сдано в аренду по договору аренды |
| Капитальные строения расположены на земельном участке с кадастровым номером 321282804101000787 площадью 0,0617 га по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, Кормянский с/с, аг. Корма, ул. Кирова С.М., 120А |
| Лот включает оборудование в количестве 8 ед. Перечень имущества опубликован на сайте **www.deloocenka.by** |
| **Начальная цена** продажи без НДС – 41 380,00 бел. руб. **Задаток** – 413,80 бел. руб. |
| **Лот № 5:** капитальное строение с инв. № 311/С-50661 общей площадью 216,0 кв. м, наименование – кафе-кулинария, назначение – здание специализированное для общественного питания, составные части и принадлежности – одноэтажное кирпичное здание, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 321282804101000454 площадью 0,0659 га по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, Кормянский с/с, аг. Корма, ул. Комсомольская, 1. Лот включает оборудование в количестве 8 ед. Перечень имущества опубликован на сайте **www.deloocenka.by** |
| **Начальная цена** продажи без НДС – 32 300,00 бел. руб. **Задаток** – 323,00 бел. руб. |
| **Лот № 6:** капитальное строение с инв. № 311/С-51318 общей площадью 64,6 кв. м, наименование – магазин № 18, назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности – одноэтажное кирпичное здание с надворными постройками: сараем, уборной, двумя крыльцами, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 321250100003001592 площадью 0,0316 га по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Крылова. Лот включает оборудование в количестве 5 ед. Перечень имущества опубликован на сайте **www.deloocenka.by** |
| **Начальная цена** продажи без НДС – 40 354,00 бел. руб. **Задаток** – 403,54 бел. руб. |
| **Лот № 7:** капитальное строение общей площадью 124,7 кв. м, наименование – здание магазина, назначение – нет сведений, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 321275703601000472 площадью 0,0752 га по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, Тереховский с/с, г. п. Тереховка, ул. Ленина В. И. |
| Лот включает оборудование в количестве 12 ед. Перечень имущества опубликован на сайте **www.deloocenka.by** |
| **Начальная цена** продажи без НДС – 67 800,00 бел. руб. **Задаток** – 678,00 бел. руб. |
| **Лот № 8:** СОТ Кореневка (торговый пав.), инв. № 1355/474, морозильник ММ 163, инв. № 247/3321, холодильник торг., инв. № 1518/492, сигнализация пожарн., инв. № Хза304, сигнализация охр., инв. № Хза87, ТОРГОВОЕ ОБОР. (прилавок), 2 шт., инв. № Хза89, ТОРГОВОЕ ОБОР. (стеллажи), 3 шт., инв. № 1356/474 |
| **Начальная цена продажи без НДС** – 5 986,00 бел. руб. **Задаток** – 59,86 бел. руб. |
| Расходы по приведению в надлежащий вид всей необходимой документации, государственной регистрации договора купли-продажи и перехода права на предмет аукциона возлагаются на Победителя аукциона |

**Продавец: Добрушское РайПО**, г. п. Тереховка, ул. Вокзальная, 47. Конт. тел.: +375 232 34-98-92, +375 44 590-84-01.

**Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»: BY60BELB30121322650030226000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, пр-т Ленина, 10, БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00** до **13.00** и с **14.00** до **17.00** от даты опубликования настоящего извещения. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 05.05.2025 г. в 17.00.** Порядок участия и проведения аукциона с перечнем необходимых документов опубликован на сайте **www.deloocenka.by**

**Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения.** Единственный участник имеет право приобрести лот с шагом 5 %. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** с момента подписания протокола; стоимость, сформированная в результате аукциона, должна быть выплачена продавцу в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента проведения торгов. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости предмета оценки. Указанные объекты никому другому не проданы, не заложены, под запретом не состоят, судебного спора о них не имеется, других владельцев нет. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Конт. тел. организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62**

## Крынічка

Вядучая рубрыкі Марына ВЯРЭНІЧ.

# КРАСАВІК ЛЯНІВАГА НЕ ЛЮБІЦЬ

У гэтым месяцы ўжо сапраўды адчуваецца веснавое цяпло. І з яго надыходам настае час вялікай работы ў садзе і на агародзе: пачынаецца самы гарачы сезон. А каб нічога не выпусціць з-пад увагі, варта намеціць план садова-агародных работ на красавік.

## Генеральная прыборка саду і агарода

Асноўная задача ў пачатку сезона — падрыхтоўка тэрыторыі да пасадак і прыборка саду пасля зімы. Прыбіраюцца смецце, сухія галінкі і леташняя мульча. Усё гэта можна спаліць або скласці ў кампосную яму. Другі варыянт нават лепшы, бо з перагнілага лісця атрымаецца выдатнае ўгнаенне. Але калі ёсць падазрэнне на грыбок, цвіль і шкоднікаў, то ўсё ж лепш спаліць раслінныя рэшткі. Попел можна выкарыстоўваць як угнаенне. Калі ў садзе затрымліваюцца і назапашваюцца талыя воды і глеба залішне вільготная — пракапайце канаўкі.

Насенне, якое пасеялі на расаду ў лютым—сакавіку, ужо прарасло і патрабуе пікіроўкі і перасадкі. Уважліва агледзьце расаду на прыкметы захворванняў. Нельга залішне палівадь сеянцы, таму што яны могуць загінуць. Расаду, прызначаную для высадкі ў адкрыты грунт, неабходна выносіць ненадоўга на свежае паветра для яе загартоўвання.

## Падрыхтоўка ягадніку

Сунічную плантацыю трэба апрацаваць у першую чаргу. З кустоў прыбіраюцца засохлыя лісце і вусікі. Рабіце гэта асцярожна, каб не закрануць цэнтральнае «сэрцайка». Цяпер галоўнае ачысціць усё, што засталося ад старых раслінных рэштак, разрыхліць глебу і пакінуць расліны набірацца сіл ды нарошчваць лісце. Трэба перакапаць зямлю вакол ягадных кустоў, унесці азотазмяшчальныя ўгнаенні, каб расліны пачалі нарошчваць вегетатыўную масу.

## Агародныя клопаты

Менавіта цяпер мэтазгодна спланаваць сяўбу культур на ўчастку з улікам севазвароту. У пачатку месяца можна сеяць пятрушку і кроп. Ужо бліжэй да мая ў вас на стале будзе свежае зеленіва. Шматгадовыя агародніння расліны, такія як шчаўе, цыбуля-батун і іншыя, неабходна вызваліць ад старога лісця і мульчы. Падрыхтуйце таксама да пасадкі бульбу. За 20—30 дзён яе дастаюць са склепа і перабіраюць, пакідаючы толькі моцныя і здаровыя клубні. Далей насенне лепш раскласці ў адзін пласт у скрыні для прарошчвання, каб з'явіліся моцныя парасткі. Так бульба будзе хутчэй развівацца ў зямлі, і вы раней атрымаеце ўраджай.

## Ваша пытанне



У рэдакцыю звярнулася наша пастаянная падпісчыца Зінаіда Васільеўна Якімава са Стоўбцаў, якая выпісвае «Звязду» на працягу 35 гадоў. Яна пацікавілася, ці бяспечна браць сок з бярозы, якая пашкоджана белай амялой?

Адказ адназначны — з такога дрэва збіраць сок нельга. Амяла выдзяляе таксіны, якія назапашваюцца ў тым ліку і ў бярозавіку. Таму, перад тым як рабіць падсочку, абавязкова пераканайцеся, што дрэва здаровае. Калі з бярозай усё ў парадку, можна смела пачынаць збор соку. І яшчэ звяртаем вашу ўвагу: не варта збіраць сок з дрэў, якія растуць блізка ад дарогі. Бяроза паглынае ў велізарнай колькасці разнастайныя таксічныя рэчывы з глебы і выступае ў якасці ачышчальніка, але сама назапашвае шмат таксінаў, якія канцэнтруюцца ў соку.

Беражыце сябе і будзьце здаровыя.






Фота Валянціны ДОЎНАР.

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 216

**Фінішаваў зладжаны бюлетэнем «Альбіна» міжнародны конкурс складання задач памяці беларускага майстра Мікалая Бельчыкава.**

Сярод 56 двухходовых задач суддзя раздзела Віктар Волчак размеркаваў адзнакі так.

Прызы: 1-2) Марка Гуіда (Італія) і Анатоль Слесарэнка (Расія); 3-4) Васіль Маркоўцый (Славакія) і Павел Мурашоў (Расія); 5-6) Драган Стойніч (Сербія) і Жэрар Доўхан (Францыя); 7-8) П. Мурашоў і М. Гуіда; спецыяльны прыз — Ігар Агапаў (Расія).

Пачэсныя водгукі: 1) П. Мурашоў; 2) Чэслаў Якубоўскі (Беларусь); 3) Хасэ Луіс Веласка (Іспанія); 4) Мікалай Быкаў і Міхаіл Мароз (Беларусь); 5) Золтан Лабаі (Славакія) і Мірaслаў Світэк (Чэхія); 7) Відадзі Заманаў (Азербайджан); 8) Эдуард Нагавіцын (Расія); спецыяльны прыз — Эльмар Абдулаеў (Азербайджан).

Пахвальныя водгукі: 1) М. Быкаў, М. Мароз; 2) З. Лабаі, М. Світэк; 3) М. Світэк; 4) Ч. Якубоўскі; 5) Мікалай Скамарошанка (Расія); 6) Луіс Гомес Палазон (Іспанія); 7) З. Лабаі; 8) Юрый Аляксееў (Расія); спецыяльны прыз — Жыван Зузуліч (Сербія).

Падраздзел мініяцюр. Прызы — В. Маркоўцый і Ч. Якубоўскі; пачэсныя водгукі — Міхаіл Кошаль (Беларусь) і Генадзь Мацюшын (Расія); пахвальныя водгукі — Э. Нагавіцын і Мікалай Зуеў (Літва).

А восль якія з 49 трохходовых задач адзначыў суддзя раздзела Ігар Агапаў.

Прызы: 1) Валерый Кірылаў і Сяргей Хачатураў (Расія); 2) Аляксандр Шпакоўскі (Расія); 3) Аляксандр Феакціставаў (Расія); 4) Ж. Доўхан; спецыяльны прыз — Д. Стойніч.

Пачэсныя водгукі: 1) Юрый Гарбаценка (Расія); 2) Леанід Любашэўскі і Леанід Макаронец (Ізраіль); 3) А. Шпакоўскі; 4) Вячаслаў Красічонак і Віктар Волчак (Беларусь).

Пахвальныя водгукі: 1) Л. Любашэўскі, Л. Макаронец; 2) В. Заманаў і Генадзь Ігнаценка (Расія); 3) Г. Ігнаценка; 4) М. Зуеў; 5) В. Волчак; 5) Мікіта Краўцоў (Расія); 6) Г. Мацюшын; 7) З. Лабаі; 8) Э. Абдулаеў; спецыяльны прыз — Мігель Урыс (Іспанія).

Падраздзел мініяцюр. Прызы: 1-2) М. Краўцоў і Ч. Якубоўскі. Пачэсны водгук: Ч. Якубоўскі. Пахвальныя водгукі: 1) Ю. Аляксееў; 2) М. Зуеў; 3. Віктар Жук (Беларусь).

Прапануем для рашэння прызавую задачу Васіля Маркоўцыя (*гл. дыяграму*).



**Белыя:** Кра3, Фd5, Лb3, Сb4, Ка6 (5).

**Чорныя:** Кра7, nb6 (2).

Мат за 2 хады.

**Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі (220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, «Звязда») або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru.**

* * *

У Оршы адбыўся XXIII шахматны фестываль. У турніры «А» (89 удзельнікаў) прызавую тройку склалі Вячаслаў Зарубіцкі, Міхей Навуменка і Ксенія Зелянцова. У майстарскім турніры перамог Міхаіл Спіжарны. У хуткіх шахматах (83 гульцы) на першым месцы Віталь Цяцераў, а два наступныя падзялілі Максім Царук і Міхаіл Спіжарны.

У Мінску прайшоў традыцыйны «Мемарыял Д. І. Браншцэйна» па хуткіх шахматах (272 удзельнікі, у тым ліку 4 гросмайстры, 5 міжнародных майстроў і 11 майстроў ФІДЭ). Тры прызавыя месцы занялі Максім Царук, Арцём Стрыбук і Аляксей Аляксандраў. Сярод жанчын найлепшыя — Варвара Паляквoва, Аляксандра Тарасенка, Марыя Герасімава. Сярод ветэранаў — Андрэй Кавалёў, інвалідаў — Міхаіл Дзенісеня, юнакоў — Антон Цімашэнка.

Зборная мінскага РЦАП (Мацвей Савельеў, Дамір Булгак, Павел Поўх і Ніка Венская) заваявала бронзавыя медалі на дзіцячым камандным турніры ў казахстанскім Жэзказгане.

На юніёрскім чэмпіянаце свету ў Чарнагорыі (157 удзельнікаў) Максім Царук заняў 29-е месца. Сярод 98 юніёрак Аляксандра Тарасенка была 41-я, Ксенія Зелянцова — 59-я.

* * *

Задача з мінулага выпуску рашаецца: 1. b4! (1. Кpb8? Крc4!; 1. Сb3? Кра6!; 1. Фf6? Кра5!). Правільна адказалі Леанід Шацько, Ігар Ананіч, Васіль Жуковіч, Віктар Жук, Васіль Барысевіч, Сяргей Цяльпук.

**Вадзім ЖЫЛКО.**

## 3 КРАСАВІКА Даты Падзеі Людзі




**1885** год — нарадзіўся Барыс Вількіцкі, рускі марскі афіцэр, капітан 1-га рангу, гідрограф, геадэзіст, даследчык Арктыкі, першаадкрывальнік Паўночнай Зямлі. Беларус па паходжанні. Імем Вількіцкага былі названы астравы ў моры Лапцевых, адкрытыя экспедыцыяй Амундсена ў 1919 годзе. Навуковец унёс шэраг канструктыўных прапаноў па арганізацыі суднаходства па так званым Карскім марскім шляху, удзельнічаў у падрыхтоўцы і правядзенні Карскіх экспедыцый, забяспечыў паспяховы пераход вялікіх груп транспартных суднаў і грузавыя аперацыі.

**1890** год — нарадзіўся Барыс Маркавіч Шпенцэр, вучоны ў галіне хімічнай тэхналогіі, доктар хімічных навук, прафесар, член-карэспандэнт НАН Беларусі. Быў членам прэзідыума і вучоным сакратаром Камітэта па хімізацыі СССР, старшынёй Савета па вывучэнні прадукцыйных сіл Беларусі і кіраўніком сектара хімічнай тэхналогіі Інстытута хіміі АН БССР.




**1885** год — нямецкі інжынер Готліб Даймлер атрымаў патэнт на аднацыліндравы рухавік унутранага згарання з вадзяным ахаладжэннем.

**1920** год — нарадзіўся Юрый Нагібін, рускі савецкі пісьменнік. Аўтар зборнікаў апавяданняў і аповесцяў «Перад святам», «Далёкае і блізкае», «Завулкі майго дзяцінства» і інш. Шмат пісаў на беларускім матэрыяле. Паводле яго аповесці «Старонкі жыцця Трубнікава» пастаўлены фільм «Старшыня»; правобраз галоўнага героя — старшыня калгаса «Рассвет» Магілёўскай вобласці К. П. Арлоўскі. Аповесць «На ціхім возеры» прысвечана нарачанскім рыбакам.

**1924** год — нарадзіўся Марлон Брандо, вядомы амерыканскі акцёр кіно. Здымаўся ў фільмах «Трамвай «Жаданне», «Апошняе танга ў Парыжы», «Хросны бацька», «Вострaў доктара Мора» і інш.

**1973** год — амерыканскі вынаходнік Марцін Купер здзейсніў першы ў гісторыі званок з сотавага тэлефона. І тэлефанаваў інжынер фірмы Motorola не каму-небудзь, а свайму галоўнаму канкурэнту — Джаэлу Энгелу, супрацоўніку кампаніі Bell Laboratories, які вёў распрацоўкі ў тым жа кірунку.


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспр. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 12 177. Індэкс 63850. Зак. № 778.

Нумар падпісаны ў 19.30 2 красавіка 2025 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12